Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І УПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 39 (453) | Чацвер, 23 лістапада 1939 года | Цана 20 кап.

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАВЕКІ З'ЕДНАНЫ ВЯЛІКІ БЕЛАРУСКІ НАРОД!

ЗАКОН

АБ ПРЫНЯЦЦІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў САСТАЎ БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, заслухаўшы заяву Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, **пастанаўляе:**

1. Вітаць усямерна гістарычную пастанову Вярхоўнага Совета СССР ад 2-га лістапада 1939 года аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Совецкага Саюза.

2. Прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і з'еднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве.

3. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета назначыць дзень выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР ад Заходняй Беларусі.

4. Даручыць Прэзідыуму Вярхоўнага Совета БССР вызначыць адміністратыўнае дзяленне абласцей і раёнаў Заходняй Беларусі і, у адпаведнасці з пунктам «б» артыкула 19 Канстытуцыі БССР, прадставіць на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР праект аб утварэнні новых абласцей і праект размежавання раёнаў і абласцей паміж Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай і Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

14 лістапада 1939 г. г. Мінск.

НАВЕКІ З'ЕДНАН ВЯЛІКІ БЕЛАРУСКІ НАРОД

17 верасня 1939 года ўвойдзе ў гісторыю украінскага і беларускага народаў, як адна з самых знамянальных дат, калі мудры Совецкі ўрад аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці граніцу і ўзяць пад абарону адзінакроўных братоў-украінцаў і братоў-беларусаў.

Выконваючы волю народаў СССР, гераічная Чырвоная Армія магутным ударам, з невядомай у гісторыі хуткасцю палоніла польскую армію, а тую частку яе, што супраціўлялася, знішчыла.

Кічлівыя пеўні ў ботах, усе гэтыя Рыдз-Сміглы, ганарлівыя свінні ў фраках няўдалага версальскага пакроя, Бекі і ім падобныя бандыты, уся былая правячая кліка былой панскай Польшчы пры першым сур'ёзным выпрабаванні, захапіўшы ўсякі выпадак золата, каб мець магчымасць працягваць свае брудныя справы, ганебна падалася ў кусты, кінуўшы народ на волю лёсу.

У неймаверна цяжкіх, у жудасных умовах жылі працоўныя Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Іх за людзей не лічылі. Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь была ператворана ў калонію польскага імперыялізма.

Дзікія здзекі і катаванні, турмы і шыбеніцы, лютая расправа над працоўнымі, пагарджанне культурай украінцаў і беларусаў, забарона вучыць дзяцей і размаўляць на роднай мове, зверская эксплаатацыя працоўных—вось чым славілася былая панская Польшча.

Многа перанеслі гора і пакут у панскай Польшчы яўрэйскія працоўныя масы і другія народы няпольскай нацыянальнасці. Панская Польшча была краінай турмаў, дзікага разгулу «цывілізаваных бандытаў».

У былой панскай Польшчы 45 процантаў лепшых зямель знаходзілася ў руках памешчыкаў, вялікая плошча была аддадзена асаднікам. Селянін, які меў невялічкі кавалак зямлі, быў абцяжаран вялікімі падаткамі, шматлікімі штрафамі і жыў упрогаладзь. Не было за што купіць самага неабходнага — солі, запалак, газы, мыла.

Жудаснай эксплаатацыі падвяргаліся рабочыя ў былой панскай Польшчы, асабліва на «крэсах усходніх». У параўнанні з цэнтральнай Польшчай, тут рабочыя атрымоўвалі значна меншую зарплату. А многія гадамі не мелі работы і вымушаны былі галадаць.

Не лепш жылося і працоўнай інтэлігенцыі. Многія з работнікаў тэхнікі, навукі і мастацтва, урачы, настаўнікі, кампазітары, паэты і пісьменнікі—працавалі не па сваёй спецыяльнасці—абы мець кавалак хлеба, а многія з іх зусім не мелі магчымасці дастаць работу.

Працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ўсыпалі кветкамі шляхі, дзе праходзіла Чырвоная Армія, сустракалі чырвоных багатыроў хлебам і соллю.

Цяпер працоўныя Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ўліліся ў адзіную дружную сталінскую сям'ю народаў СССР. Яны пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі на чале з вялікім Сталіным будуць працаваць над аднаўленнем сваёй разбуранай гаспадаркі і культуры.

Больш ніколі і нікому не ўдасца закабаліць свабодны украінскі і беларускі народ. Больш ніколі і нікому не таптаць нашы зялёныя лугі, не паіць у нашых серабрыстых рэчках варожых коней. Больш ніколі і нікому не прыдзецца здзекавацца з беларускіх і украінскіх жанчын і дзяцей. Яны сталі грамадзянамі вялікага СССР.

Працоўныя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны разам з усімі народамі Совецкага Саюза будуць мацаваць усімі любімую, выхаваную партыяй Леніна—Сталіна, загартаваную ў баях, ніколі і нікім непабедзімую Чырвоную Армію, якая стаіць на варце і ахоўвае мірную працу свабодных народаў СССР.

Беларускі народ разам з магутнай, авеянай славай, легендарнай Чырвонай Арміяй ператворыць заходнія рубяжы ў непрыступную крэпасць, аб якую разаб'юць галовы ўсе тыя, хто паспрабуе на нас напасці.

Працавіты беларускі народ Заходняй Беларусі, пры падтрыманні і дапамозе народаў СССР і ў першую чаргу вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і правадыра ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва свету, геніяльнага Сталіна, хутка залечыць раны, нанесеныя спрадвечнымі ворагамі беларускага народа — ненавіснымі польскімі панамі.

Скончыліся пакуты працоўных Заходняй Беларусі. Вялікі беларускі народ навекі з'еднан. Працоўныя Заходняй Беларусі зажывуць шчаслівым жыццём пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

ПРЫВІТАННЕ таварыша СТАЛІНА

Байцам і кіраўнікам І Коннай арміі ў дзень яе дваццацігадовага юбілея — баявое прывітанне!

Прывітанне Будзённаму, Варашылаву, Куліку, Цімашэнка, Шчадэнка, Гарадавікову, Апанасенка, Тюленову, Чаравічэнка, Еременка і іншым, паклаўшым аснову коннай арміі і ператварыўшым яе ў грозную сілу!

Прывітанне байцам, камандзірам, палітработнікам коннай арміі, разграміўшым генералаў Дзенікіна, Мамантава, Шкуро, Чэснакова, Врангеля і апракінуўшым войскі Пілсудскага ў часе гістарычнага рэйда ў раёне Житоміра!

Прывітанне ўсёй нашай конніцы, у тым ліку — нашым конармейцам, пакрыўшай сябе славай у баях за вызваленне Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў!

Вечная памяць і слава таварышам Пархоменка, Дундзічу, Марозаву, Літунову, Бахтураву і многім іншым конармейцам, склаўшым свае галовы ў бітвах за перамогу нашай вялікай совецкай радзімы!

І. СТАЛІН.



ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ АБ ПЕРШАЙ КОННАЙ АРМІІ

Публікуемыя ніжэй дакументы рысуюць асобныя моманты гераічнай барацьбы Першай Коннай арміі. Створаная па ініцыятыве таварыша Сталіна, Першая Конная армія адыграла рашаючую роль у выкананні яго геніяльнага плана разгрому Дзенікіна. Першая Конная армія бліскуча справілася з ускладзенай на яе задачай—быць ударнай групай Паўднёвага фронта, знішчыць адборныя часці Дзенікіна, асабліва яго конніцу, разграміць тылы праціўніка. Дзякуючы штодзённым клопатам і ўвазе таварыша Сталіна, Першая Конная армія стала непераможнай сілай, адыграўшай велізарную роль у барацьбе Чырвонай Арміі супроць генералаў Краснова, Дзенікіна, польскай арміі і Врангеля.

Тэлеграма «Конкорпус, Будзённаму» ад 28 кастрычніка 1919 г. з'яўляецца адказам таварыша Сталіна на дакладную запіску Рэўваенсовета Коннага корпуса—тт. Варашылава, Будзённага і Шчадэнка, якія прасілі ўстараніць адначасовае падпарадкаванне Коннага корпуса — 10-й арміі, Паўднёваму фронту і асобай групе Паўднёва-Усходняга фронта. Гэта адзін з першых дакументаў, дзе таварыш Сталін гаворыць аб неабходнасці стварэння Першай Коннай арміі.

Тэлефонаграма ад 23 снежня 1919 г., пераданая В. І. Леніну ад Рэўваенсовета Паўднёвага фронта па даручэнню таварыша Сталіна, паведамляе аб разгроме Першай Коннай арміяй белагвардзейскай коннай групы генералаў Мамантава, Улагая, Шкуро і Чэснакова і аб уступленні першай Коннай арміі ў Данбас.

Тэлеграма тав. Будзённаму і тэлефонаграма В. І. Леніну публікуюцца ўпершыню.

ІНСТЫТУТ МАРКСА—ЭНГЕЛЬСА—ЛЕНІНА ПРЫ ЦК ВКП(б).

КОНКОРПУС. БУДЗЁННАМУ

СЕРПУХОЎ, 28 кастрычніка 1919 г.

Давераны Вам корпус ва ўсіх адносінах падначален выключна Паўднёваму фронту. Пытанне аб прадуктах харчавання корпуса будзе пастаўлена на належную вышыню, аб чым аддаю распараджэнне начснаб і прадкамюж. Аб грашовым давольстве корпуса зроблена распараджэнне начснабюж. Меркаванне аб часовай перадачы Вам адзінаццатай кавдывізіі мае мэтай, што дывізія пад Вашым кіраўніцтвам у баявых адносінах зробіцца такой-жа, як і астатнія вашы дывізіі 4 і 6. У бліжэйшым будучым мяркуецца стварыць другі конкорпус з адзінаццатай і восьмай дывізій. Абодва корпусы мяркуецца аб'яднаць пад Вашым кіраўніцтвам на правах Коннай арміі. У даны момант адзінаццатая кавдывізія — толькі дзве брыгады, трэцяя ідзе з Туркфронта. Фактычную перадачу ўказанай дывізіі ўкажу дадаткова пасля высвятлення абстаноўкі бліжэйшых дзён. Данасіце на прад'яўленае вам запытанне адной з папярэдніх тэлеграм адносна комсастава для гэтай дывізіі. Корпусу іменавацца «Конкорпус Паўднёвага фронта» № 11 325 ОП.

ЧЛЕН РВС СТАЛІН.

ТЕЛЕФОНАГРАМА тав. ЛЕНІНУ

По загаду Сталіна перадаю наступнае:

У баях ад 20-га снежня, на пераправе праз Паўночны Данец коннай арміяй Будзённага разбіта на-галаву конная група праціўніка ў саставе часцей Мамантава, Шкуро і Улагая са зводнай Кубанскай дывізіі генерала Чэснакова. Намі захвачана 15 гармат, 80 кулямётаў, звыш 1.000 коней з сёдламі, абозы, 300 кавалерыстаў, вялікая колькасць важных дакументаў. Зарублена больш 1.000 белых казакаў, у тым ліку і генерал Чэснакоў. Намі заняты станцыі Несвецевіч і Лісічанск. Мост праз Данец справілі. Нашы перадавыя часці ўступілі непасрэдна ў вугальны раён.

КІРАЎНІК СПРАЎ РВС ПАЎДНЁВАГА ФРОНТА.

Прынята 23/XII. 14 гадзін.

ПРЫВІТАННЕ ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ І СНК БССР БАЙЦАМ, КАМАНДЗІРАМ І ПАЛІТРАБОТНІКАМ КАВАЛЕРЫЙСКІХ ЧАСЦЕЙ І ЗЛУЧЭННЯЎ БЕЛАРУСКАГА ФРОНТА

ЦК КП(б) Беларусі і СНК БССР віншуюць байцоў, камандзіраў і палітработнікаў кавалерыйскіх часцей і злучэнняў Беларускага фронта ў дзень слаўнага дваццацігадовага юбілея Першай Коннай арміі.

Прывітанне слаўным патрыётам і ўдзельнікам арганізацыі Першай Коннай арміі таварышам **Чаравічэнка** і **Еременка.**

Чэсць і слава байцам, камандзірам і палітработнікам кавалерыйскіх часцей і злучэнняў Беларускага фронта — вызваліцелям працоўных Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў.

Вечная памяць і слава байцам, камандзірам і палітработнікам конармейцам, склаўшым свае галовы за справу вызвалення працоўных Заходняй Беларусі.

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. ПАНАМАРЭНКА.
Старшыня СНК БССР К. КІСЯЛЁЎ.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні ордэнам Леніна маршала Совецкага Саюза тав. Будзённага С. М.

У сувязі з 20-годдзем 1-й Коннай арміі, за выключныя заслугі ў справе арганізацыі 1-й Коннай арміі ўзнагародзіць ордэнам Леніна маршала Совецкага Саюза тав. **Будзённага** Сямёна Міхайлавіча.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
17 лістапада 1939 г.

Узнагароджанне артыстаў і работнікаў Галоўнага ўпраўлення дзяржаўных цыркаў

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за выдатныя заслугі ў справе развіцця совецкага мастацтва, у сувязі з дваццацігоддзем совецкага цырка ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Саюза 205 артыстаў і работнікаў Галоўнага ўпраўлення дзяржаўных цыркаў.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны: В. Г. Дураў-Шаўчэнка — артыст дзяржаўных цыркаў, Е. Ташкенбаеў — заслужаны артыст Узбекскай ССР і Б. А. Эдэр — заслужаны артыст РСФСР.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджана 24 чалавекі, ордэнам «Знак почета» — 70 чалавек, медалю «За трудовое отличие» — 108 чалавек.

У прыватнасці, ордэнам «Знак почета» ўзнагароджан дырэктар Мінскага, Бабруйскага, Гомельскага і Віцебскага цыркаў тав. Б. Х. Кабішчэр.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Днямі адбыўся чарговы пленум Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі з удзелам сакратароў абкомаў, гаркомаў, райкомаў партыі і старшынь райвыканкомаў.

Пленум абмеркаваў пытанні:

1. Аб задачах партыйнай арганізацыі Беларусі па завяршэнню сельскагаспадарчых работ 1939 года.

2. Аб ходзе выканання рашэння ЦК ВКП(б) ад 16 ліпеня 1939 года «Аб пастаноўцы прапаганды марксізма-ленінізма ў Беларускай ССР».

Па ўсіх гэтых пытаннях пленум прыняў адпаведныя рашэнні.

Пленум вызваліў ад абавязкаў другога сакратара ЦК КП(б) Беларусі тав. Кальцова П. А. і ад абавязкаў сакратара ЦК КП(б) Беларусі тав. Жылянiна Я. А. у сувязі з іх пераходам на другую работу.

Пленум выбраў другім сакратаром ЦК КП(б) Беларусі тав. Кулагіна М. В. і сакратаром ЦК КП(б)Б па кадрах тав. Байкачова Г. М.

ВЫСТАЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ 60-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ таварыша СТАЛІНА

Пры Віцебскім гістарычным музеі адкрылася выстаўка — «Жыццё і дзейнасць таварыша Сталіна», прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння правадыра народаў.

На выстаўцы прадстаўлены шматлікія матэрыялы ў карцінах, гравюрах, фотаздымках і копіях дакументаў, якія адлюстроўваюць багатае, поўнае барацьбы, жыццё найвялікшага генія эпохі, натхніцеля і арганізатара перамог соцыялізма, правадыра народаў СССР і прыгнечаных усяго свету — вялікага Сталіна.

Экспазіцыя матэрыялаў выстаўкі ажыццёўлена ў сямі раздзелах. Першы і другі раздзелы адлюстроўваюць абставіны, у якіх таварыш Сталін правёў дзяцінства і юнацкія годы, пачатак рэволюцыйнай дзейнасці, першы арышт пасля ўдзелу ў батумскай дэманстрацыі 1902 года і кіраўніцтва ёю, затым пабег з ссылкі ў 1904 годзе.

Асабліва шырока прадстаўлен чацверты раздзел выстаўкі, які ахапляе перыяд 1917—1920 гадоў. Ва ўсю шырыню ўстае перад гледачом гіганцкая барацьба таварыша Сталіна за забеспячэнне перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, непасрэднае асабістае кіраўніцтва таварыша Сталіна ўзброенай барацьбой рабочых і сялян на шматлікіх франтах супроць ворагаў маладой совецкай рэспублікі. У невялікай рамцы пад шклом — дакумент, які расказвае аб узнагародзе таварыша Сталіна баявым ордэнам Чырвонага Сцяга за гераічную абарону Петраграда ў 1919 годзе.

Сёмы і апошні раздзел выстаўкі прысвечан таварышу Сталіну, як натхніцелю і творцу самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі.

Выстаўка выклікала выключную цікавасць сярод насельніцтва. Яе наведваюць рабочыя, чырвонаармейцы і камандзіры, шматлікія экскурсіі вучняў сярэдніх школ і студэнты вышэйшых навучальных устаноў. Штодзённа выстаўку наведвае ў сярэднім да 200 чалавек, а ў паасобныя дні — да 700 чалавек.

СКУЛЬПТУРА „СТАЛІН—ЗОДЧЫ"

Скульптар А. М. Бразер закончыў вялікую скульптуру «Сталін — зодчы». Скульптар вельмі ўдала і своеасабліва выразіў вобраз вялікага правадыра народаў — зодчага соцыялізма, зодчага шчасця працоўнага чалавецтва. У скульптуры адчуваецца веліч і разам з тым скромнасць і чалавечнасць правадыра народаў.

Скульптура прызначана для выстаўкі, прысвечанай 60-годдзю з дня нараджэння І. В. Сталіна.

А. М. Бразер працаваў над скульптурай больш года.

СЛУЖБА НАРОДУ

Было гэта некалькі год назад. Маршал Будзённы праводзіў агляд у адной з кавалерыйскіх часцей Беларускай Акругі. Прыехаў Сямён Міхайлавіч у часць, да самага пад'ёму байцоў, разам з імі пайшоў у стайню на першую ранішнюю чыстку коней, пастаяў ля конавязі, наглядаючы за тым, як байцы чысцяць, мыюць сваіх баявых сяброў, даваў парады і вось ужо далёка за поўдзень, а маршал, вопытнейшы коннік Чырвонай Арміі, і не думае яшчэ ад'язджаць. Сямён Міхайлавіч дабрадушна пакручвае свае пышныя вусы і ласкава ўсміхаецца. Значыць добра, спадабалася. Байцы не адводзяць вачэй ад легендарнага героя. Часам ім не верыцца, што перад імі стаіць сам Будзённы, той, чыё імя яны ведалі ледзь не з дзяцінства, той, чыё імя яны апявалі ў песнях.

Нарэшце, Сямён Міхайлавіч скончыў агляд. Паволыным крокам ён выходзіць наперад і, павярнуўшыся да байцоў, проста гаворыць:

— Вельмі задаволен вамі, таварышы. Для кавалерыста даражэй за ўсё, калі ён бачыць, што чырвоныя воіны клапатліва даглядаюць сваіх коней, калі яны памятаюць той невялічкі вершык, які я ў вас толькі-што прачытаў ў стайні на плакаце...

І Сямён Міхайлавіч, пасля секунднай паўзы, гаворыць:

Конь—товарищ твой по службе,
Твой товарищ по войне,
Будь с конем в хорошей дружбе,
Помни крепко о коне...

Бачыце, як правільна сказана!..

Байцы слухаюць, стрымаўшы дыханне. Які-ж гэта чырвоны кавалерыст ці казак можа не «сябраваць» з канём? Але зараз, калі аб гэтым гаворыць сам Будзённы, неабходнасць «сяброўства» адчуваецца яшчэ вастрэй... Будзённы скончыў, па ўсёй плошчы доўга, гучна, пераліваючыся грыміць кавалерыйскае «ура».

Увечары ў ленінскім кутку, асветленым лямпамі з абажурамі, байцы збіраюцца ля карты паходаў Першай коннай і там пачынаюцца задушэўныя расказы аб будзёнаўскай конніцы.

Сямён Будзённы, унтэр-афіцэр царскай арміі, храбрэйшы з храбрых, і на імперыялістычнай вайне паспеў атрымаць георгіеўскі крыж, але крыж хутка адабралі за тое, што, абараняючы гонар салдат, ён збіў аднаго афіцэра. Прыйшлося пакінуць фронт, з цяжкасцямі дабірацца да сваёй радзімай станіцы. А там ужо было неспакойна. Пасля рэволюцыі станіца падзялілася на два лагеры. Бядняк і пастух Сямён Будзённы зараз-жа далучыўся да лагера працоўных. Тут-жа у Платаўскай пачалося яго сапраўднае, баявое жыццё. Ноччу з атрадам смельчакоў ён напаў на родную станіцу, якая была ў руках залатапагоннікаў. Нападаўшых было ў тры разы менш, але з імі быў Будзённы. У першую чаргу вызвалілі палонных, сярод якіх быў і стары Міхаіл Будзённы, бацька Сямёна, потым захапілі гарматы, кулямёты, тачанкі і адсюль, з гэтай летняй ночы, пачаўся рэйд, які даўно ўжо ўвайшоў не толькі ў гісторыю Чырвонай Арміі, але і ўсіх армій.

Чуткі аб Будзённым і аб яго атрадзе пайшлі па станіцах і праз некалькі месяцаў у платаўскага чырвонага казака ўжо было пад начальствам 10.000 байцоў.

Калі байцы скардзіліся на недахоп коней ці ўзбраення, Сямён Міхайлавіч, перш чым адказаць, па прывычцы пакруціць кончыкі сваіх чорных вусоў, а потым цвёрда і пераканаўча скажа:

— Мала коней у афіцэраў, мала ў іх шабляў, кулямётаў? Бяры ў бai, чаго глядзіш. Лепшага афіцэрскага каня бяры. Дазваляю, — і ўсміхаецца.

А байцам больш нічога не трэба. Сямён Міхайлавіч дазваляе—і ў першым-жа баі яны б'юцца, як чэрці, і, вядома, потым недахопа ў конях ужо няма.

Асабістая храбрасць заўсёды вылучала Будзённага і яго воінаў. З першых-жа дзён стварэння яго атрад не ведаў ні аднаго паражэння, а белая армія пад ударамі будзёнаўскай конніцы рассыпалася ў пыл. Калі на Паўднёвы фронт у 1919 годзе прыехаў Сталін, найвялікшы палкаводзец і стратэг, ён зараз-жа вызначыў вялікае значэнне згуртаваных конных мас, гатовых да быстрых манеўраў, перакідак, штурмаў, і тады сталінскай воляй была народжана першая ў свеце конная армія.

Будзёнаўскі атрад, які яшчэ нядаўна налічваў сотні шабляў, быў пакладзен у аснову арміі, цяпер яна мела тысячы шабляў, кулямётаў, гармат.

Першую конную ўзначальвалі Будзённы і Варашылаў. Яе баявыя аперацыі прадумвалі і дапамагалі ажыццяўляць Ленін, Сталін, Фрунзе. Будзённы і Варашылаў ужо ў той гарачы час, калі коннікі суткамі не злязалі з коней, паважалі друкаванае слова і разам з конніцай была ў паходах баявая рэдакцыя «Красный кавалерист». З якім хваляваннем пpаглядаеш сёння яе старонкі, тут побач з байцамі, якія пісалі свае вершы на кароткіх прывалах пасля баёў, друкаваўся Уладзімір Маякоўскі.

Ідуць годы. Яшчэ нядаўна коннікі святкавалі сваё дзесяцігоддзе, зараз краіна адзначыла іх дваццацігадовы юбілей. Тыя, што прыйшлі ў рады Першай коннай байцамі, сёння самі камандуюць дывізіямі, карпусамі, арміямі.

У адным з палкоў коннай арміі служыў ад'ютантам у камандзіра малады, шырокаплечы баец. Задумлівы, сур'ёзны, ён заўсёды быў у самых гарачых месцах сражэнняў. Браў Растоў, гнаў Мамантава, Шкуро, разам з конніцай рабіў вялікі рэйд 1920 года, калі пад Жытомірам былі разгромлены легіёны Пілсудскага. Скромны, маўклівы ад'ютант прыглядаўся да характару дзеянняў, да паводзінаў сваіх баявых камандзіраў і па храбрасці ён не ўступаў ім. Годы ўзялі сваё і малады хлопец вырас, узмужнеў. Але, вядома, яго можна пазнаць. Цяпер ён — з трыма залатымі нашыўкамі на рукаве і трыма ромбамі на пятліцах. Гэта — Еременка, будзёнаўскі кавалерыст, ветэран першаконнік, ад'ютант камандзіра 79 кавалерыйскага палка, а цяпер — камкор, які першы на чале чырвонай конніцы перасек заходнюю граніцу 17 верасня 1939 года і нястрымным маршам граміў белапалякаў.

Храбры, вадявы камандзір, цудоўны таварыш, легендарны герой Еременка і яго конніца ўпісалі новую залатую старонку ў кнігу баявых перамог Чырвонай Арміі. Заўсёды заняты, заўсёды сярод байцоў і камандзіраў, камкор Еременка знаходзіць час і для літаратурных заняткаў. Нядаўна камкор скончыў кнігу сваіх уласных успамінаў аб Першай коннай. Кніга яшчэ поўнасцю (за выключэннем урыўкаў у журналах) не апублікавана, яна яшчэ не атрымала назвы, але ўсё гэта ніколькі не змяншае цікавасці да яе. Ёсць такія творы, якія, па народнаму выразу, прачытаеш у адзін прысест — і кніга ўспамінаў Еременка адносіцца да ліку такіх твораў. Яе трэба чым хутчэй выдаць.

Нашы храбрыя коннікі паўтарылі на палях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны рэйд 1920 года! Над Львовам, Ноўгарад-Валынскім, Слонімам — чырвоны сцяг. Ён залунаў там навекі.

Слава вам, вялікія воіны!

Слава вам, варашылаўскія багатыры, дастойныя носьбіты непагаснучых традыцый Першай коннай арміі.

Ефім САДОЎСКІ.

Лепшых сыноў і дачок народа—у Советы дэпутатаў працоўных!

★ ★ ★

ЛАРЫСА ПАМПЕЕЎНА АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ

Кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета народнай артысткай БССР Л. П. Александроўскай пройдзен слаўны творчы шлях, прароблена вялікая грамадска-палітычная работа.

Тав. Александроўскую, як выдатную выканаўцу беларускіх народных песень, ведае ўвесь Совецкі Саюз.

Вясёлыя песні спявае наш народ пра шчаслівае і вольнае жыццё пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Разам з кампазітарамі Туранковым, Любанам, Сакалоўскім і іншымі тав. Александроўская збірала ў народзе гэтыя песні і ў мастацка апрацаваным, гарманізаваным выглядзе, з канцэртнай эстрады ў выдатным выкананні звяртала і звяртае іх народу.

Тав. Александроўская спявае народныя песні з асаблівай задушэўнасцю, з глыбокім лірызмам і драматызмам, тонка перадаючы перажыванні, думы і мары народа, якія выражаны ў яго песнях.

Л. Александроўская выступае з вялікім поспехам не толькі ў гарадах і вёсках БССР. Яна з'яўлялася дарагім госцем на эстрадзе і ў клубах Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава і іншых буйнейшых гарадоў Совецкага Саюза. Многія яе песні запісаны на пласцінкі і пашыраны па ўсёй нашай вялікай краіне.

Ларыса Пампееўна—выдатная артыстка оперы. Яна валодае цудоўным, мяккім лірыка-драматычным сапрано і надзвычайным сцэнічным абаяннем.

Пачынаючы з музычнага тэхнікума, опернай студыі і ў якасці салісткі Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета тав. Александроўская выканала шмат партый у класічных операх. У яе багатым і разнастайным рэпертуары—партыя Наташы («Русалка»), Таццяны («Еўгеній Онегін»), Лізы («Пікавая дама») і Яраслаўны («Князь Ігар»).

Ёй належыць сцэнічнае ўвасабленне рада вобразаў у арыгінальных беларускіх операх, якія выхтуюцца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Яна спявае партыі Марысі ў оперы «Міхась Падгорны» Е. Цікоцкага, Надзейкі ў «Кветках шчасця» А. Туранкова, Капрыны ў «Капрыне» Н. Шчаглова. Асаблівасцю Александроўскай, як опернай артысткі, з'яўляецца шчаслівае спалучэнне высокіх вакальных і сцэнічных якасцей, якія далі ёй магчымасць правіць свой выдатны талент і ў выкананні оперных партый. Яе гераіні поўны драматызма і душэўных пакут, яны па-сапраўднаму лірычны.



І самае каштоўнае ў творчай індывідуальнасці народнай артысткі—гэта глыбокая чалавечнасць і выключная цеплыня, якой прасякнуты ўсе створаныя ёю вобразы. Гэтай чалавечнасцю, якая ламае оперныя штампы і трафарэты, аднолькава прасякнуты як класічны вобраз Наташы, так і вобраз пакутуючай сялянскай дзяўчыны Марысі.

Тав. Александроўская—сапраўдная народная артыстка, таму што яе любіць народ, любіць глядач. Спектаклі і канцэрты пры яе ўдзеле праходзяць заўсёды з выключным поспехам.

Л. П. Александроўская не толькі выдатная артыстка, але і актыўны грамадска-палітычны працаўнік. Яна мела шчасце вітаць XVIII з'езд партыі і вялікага Сталіна ад імя беларускага народа. Гэты дзень з'яўляецца самым радасным у жыцці артысткі і яна яго заўсёды ўспамінае з вялікім хваляваннем.

Ларыса Пампееўна з выключнай адказнасцю ставіцца да сваёй творчай працы і паказвае ўзоры працоўнай дысцыпліны.

Творчая і грамадска-палітычная дзейнасць Ларысы Пампееўны Александроўскай з'яўляецца прыкладам для нашай таленавітай тэатральнай моладзі.

Л. П. Александроўская — дастойны кандыдат у дэпутаты Мінскага абласнога Совета.

М. МОДЭЛЬ.

★

НАШ НАРОДНЫ ПЯСНЯР

Рабочыя друкарні «Звязды», супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Звязда», Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БЕЛТА) і журнала «Работніца і калгасніца» вылучылі кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных народнага паэта БССР, акадэміка

ЯКУБА КОЛАСА

13 лістапада адбыўся перадвыбарчы сход калектываў друкарні і рэдакцыі газеты «Звязда», Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БЕЛТА) і рэдакцыі журнала «Работніца і калгасніца», на якім абмяркоўвалася пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

З прапановай па гэтаму пытанню выступіў тав. Гарбуноў. Ён прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных народнага паэта БССР, віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук, ордэнаносца Якуба Коласа. Імя Якуба Коласа шырока вядома ўсяму беларускаму народу, усім працоўным вялікага Совецкага Саюза. Колас сваёй выдатнай творчасцю служыць народу, прымае актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны, нястомна працуе на фронце развіцця культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Усе выступаўшыя на сходзе аднадушна адобрылі прапанову аб вылучэнні кандыдатуры Якуба Коласа. Сход прыняў наступную пастанову:

«Абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 23-й Ленінскай выбарчай акрузе горада Мінска, агульны сход рабочых друкарні «Звязда», работнікаў рэдакцыі газеты «Звязда», работнікаў Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БЕЛТА) і журнала «Работніца і калгасніца» аднагалосна пастанаўляе:

«1. Кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 23 Ленінскай выбарчай акрузе горада Мінска ад работнікаў рэдакцыі газеты «Звязда» і журнала «Работніца і калгасніца», рабочых друкарні газеты «Звязда» і работнікаў Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БЕЛТА) вылучыць тав. **Міцкевіча Канстанціна Міхайлавіча (Якуба Коласа)**, нараджэння 1882 года, беспартыйнага, ордэнаносца, народнага паэта БССР, віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР, пражываючага ў гор. Мінску.

2. Агульны сход просіць тав. Якуба Коласа даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных ад 23-й Ленінскай выбарчай акругі гор. Мінска».

Сход выбраў 5 упаўнаважаных на перадвыбарчы сход упаўнаважаных па акрузе.

★ ★ ★

ЯКУБ КОЛАС

НАД СВІСЛАЧЧУ

Растрэслі адзенне лясы,
Даўно адцвілі верасы,
І травы павялі.

Глядзяць сіратою лугі,
Пажоўклі, аселі стагі,
Да долу прыпалі.

Разліта суметы пячаць,
І кроплі імжакі блішчаць,
Як слёзы на вецці.

І я мімаволі не раз
У восенскі спознены час
Успомню аб леце.

У мыслях лячу я туды,
Дзе сонца, лясы і груды
З дубамі, з травою.

І нібы чаруючы сон,
Малюнкаў і песень шум-звон
Плывуць нада мною.

**
*

Усходзіць сонца з-за Блужскага бору
І сцеле на ўзгоркі парчу залатую,
Развешвае чырвань на хвою унь тую,

Што туліць, як маці, сям'ю маладую
Хвоінак, парослых па касагору.
Ружовыя хмаркі згортваюць шоўкі,

Відаць, каб на сонцы яны не зліналі,
А росы на травах блішчаць, бы каралі.
Спакой урачысты захоўваюць далі,

Птушыныя ловяць песні-размоўкі.
Як слаўна, хараша ў летняе ранне,
Калі атрасаюць сон пыхія гоні,

Дзе жыта пачціва каласкі клоніць,
А дымка туману кладзецца на тоні,
І луг ажывае у поўным убранні.

Выходжу на луг, на Свіслач шыбую
Ды з вудамі, з хлебам, з чарвямі і босы.
Мне ногі змываюць крыштальныя росы,

Я моўчкі вітаю дзень многагалосы,
Дубоў грамаду, красу лугавую.
І многа-ж іх тут! І ўсе як магнаты,

Глядзяць станевіта, важэнскага роду,
І кожны захоўвае чын свой і моду.
Адзін, дуплянаты, плашч звесіў на воду,

Другі, як тогу, разгортвае шаты.
А той, небарака, век дажывае.
Стаіць палысела, няма на ім кроны.

Самотны, журботны і ўвесь задумлёны.
Ляцяць к яму нанач у госці вароны,
Бусліца-ўдава падчас завітае.



Мне сумна стане, і я неўзаметкі
Гадаю аб лёсе стварэння жывога,
Як доўга працягне ён, гэты нябога,

І мне застанося самому як многа
Таптаць гэты дол, лясы і палеткі.

Гляджу я на іх, нібы на знаёмых
Ды далей мкну хутка па мяккаму груду.
Прыходжу на Свіслач, раскручваю вуду

На злосць і на зайздрасць рыбацкаму люду —
Рыбак рыбака не любіць, вядома.
А Свіслач жыве, бяжыць неўгамонна,

Разлёгшыся ў травах, у высцах пясчаных.
А колер — то цёмны, то светла-румяны
Ад яснага неба, ад чыстай паляны,

Ад дрэў і кустоў, ад ценяў бяздонных.
Насупраць — кручок, куток маляўнічы,
Там буйна буяюць кусты зелянiны

Абапал заглухлай старой азярыны,
Дзе раніцай голас звініць салаўіны,
Дзе многа звяркоў і рознае дзічы.

Мне ўсё тут знаёма: і Балачанка —
Яна тут у Свіслач якраз упадае—
І зараслей хмызу града маладая,

І Блужскае поле, і пустка глухая,
І тыя груды, і тая палянка.
Я чую — з Вусця даносяцца гукі:

Пявун зацягвае, адлічыць часінкі,
І смех бестурботны дзятвы ля адрынкі,
І крык распачлівы плаксівай дзяўчынкі.

Рып студні, сякеры мерныя стукі.
Успомню любоўна ўбогія хаткі,
І груд мой вусцянскі, і бераг зялёны,

Дзе гнуткія лозы б'юць рэчцы паклоны.
Я знаю вусцянцаў і ўсе іх імёны—
Язэп Рымашэўскі, Жук і тры Дзягкі.

Ды Вусце сягоння глухне, німее,
Змаўкае і голас у ім чалавечы —
Нясуць маё Вусце шырокія плечы.
Стаяць недаўменна адны толькі печы.
І клён каля плоту асірацее.

Ну, што-ж. Бывайце! — скажу я жычліва.
Будуйцеся ў вёсцы на новай мясціне
У дружнай і шчырай калгаснай сябрыне.
Хай добрая доля вас там не пакіне.
Багата жывіце вы і шчасліва.

Праз купы расліны сыплюцца стралы—
Паказвае сонца свой воблік адкрыты
Ды сее брыльянты на луг, аксаміты

Травы прыбяражнай, як рунь, саказітай
І на паплавок мой хітра прысела.
Гарыць і дрыжыць вясёлка-іскрынка,

Агні незлічоныя раптам зазязлі,
Брыняць жывым срэбрам па Свіслачы хвалі.
Аір і чароты страсаюць каралі —

У воду роняць расу за расінкай.
Я ўдала гляджу, сачу ўсё за вудай.
Не чую, як сядзе і тне камар вушы:

Чакаю — вось клюне штосьці з воднае глушы
І на паплаўку маім сонца патушыць,
І з поўнай пайпу рыбацкай пасудай.

Здаўлю, не здаўлю — ды я не сярджуся.
Я рады дню, сонцу, прасторнаму лугу,
Ружоваму небу і ветрыку-другу,
Што ходзіць, як сонца, па вечнаму кругу

Ды хмару прыгоніць нам дажджавую.
Я рады лету і людзям калгасным,
Прыгожству і чарам мае родных мясцінак

І тысячам кветак, мільёнам былінак,
Што нам аздабляюць жыццё, адпачынак.
Няхай-жа ім вечна дзень свеціць ясны.

3—13/XI-1939 г.

Народная артыстка

Калектыў Тэатра оперы і балета БССР вылучыў кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных народную артыстку БССР

тав. Л. П. АЛЕКСАНДРОЎСКУЮ

Сход работнікаў Вялікага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдатуры ў дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 24-й Варашылаўскай выбарчай акрузе гор. Мінска, аднадушна пастанаўляе:

«Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 24-й Варашылаўскай выбарчай акрузе гор. Мінска ад работнікаў Вялікага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР народную артыстку БССР тав. **Александроўскую Ларысу Пампееўну**, нараджэння 1904 года, беспартыйную, пражываючую ў гор. Мінску.

Агульны сход работнікаў Вялікага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР просіць тав. Александроўскую Л. П. даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 24-й Варашылаўскай выбарчай акрузе гор. Мінска».

Міхась ЛЫНЬКОЎ

ДАСТОЙНЫ КАНДЫДАТ

Нядаўна ў газеце «Праўда» пісалася, як сяляне Мікалаеўшчыны, ідучы на святочную кастрычніцкую дэманстрацыю, неслі свае арыгінальныя плакаты. На плакатах былі выпісаны вершы іх слаўутага земляка, народнага паэта нашай рэспублікі Якуба Коласа. Сяляне Мікалаеўшчыны толькі нядаўна вызваліліся з цяжкога дваццацігадовага белапольскага палона. Яны пражылі пакутнае жыццё. Яны і зналі ўсю глыбіню чалавечай нядолі, перажылі ўсе жудасці бяспраўя, здзекаў, прыгнёту. І яны не забываліся на свайго земляка. Яны верылі ў яго, яны любілі і любяць яго.

За што?

Працоўныя Совецкай Беларусі даўно ведаюць Якуба Коласа. Яго кнігі знаходзяць сабе шырокія масы чытачоў. Імі зачытваюцца і дарослы чытач і мільёны школьнікаў нашай рэспублікі. Чытаюць яго песні, раманы, захапляюцца непаўторным вобразам слаўнага дзеда Талаша, ставяць на сцэне паэтавы п'есы. Народ паважае паэта, шануе яго, урачыста спраўляе яго юбілеі, надае яму высокую годнасць, годнасць народнага паэта рэспублікі. Партыя і ўрад узнагароджваюць яго самай высокай узнагародай — ордэнам Леніна.

За што?

Мы былі на Народным Сабранні ў Беластоку. Вызвалены народ магутна распраставаў свае плечы, устанаўліваў сваю кроўную, родную, совецкую ўладу, устанаўліваў непарушныя законы аб сваім жыцці, аб зямлі, аб фабрыках і заводах, перайшоўшых у рукі адзіных гаспадароў — рабочых і сялян. І мы бачылі, як дзесяткі людзей, дзесяткі лепшых абраннікаў народа, знаёміліся з Коласам, горача віталіся з ім, як з добрым старым прыяцелем, як з верным другам, прасілі даць на добры ўспамін свой подпіс, радок верша ў спісаныя, неразоўненыя дэпутацкія блакноты. І быў такі ўрачысты момант: Народнае Сабранне абвясціла аб устанаўленні совецкай улады ў Заходняй Беларусі, аб далучэнні яе да Беларусі Совецкай. Радасныя, усхваляваныя дэпутаты запрасілі ў прэзідыум Народнага Сабрання лепшых сыноў беларускага народа, кіраўнікоў партыі і ўрада. Разам з імі былі запрошаны Янка Купала і Якуб Колас. Дэпутаты народа наладзілі ім працяглую авацыю, радасна віталі іх.

За што?

Трынаццатага лістапада гэтага года працоўныя горада Мінска па Ленінскай выбарчай акрузе № 23 вылучылі Якуба Коласа кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета. На мітынгах, на прадвыбарчых сходах мы чулі багата цёплых, прачулых слоў па адрасу кандыдата. Выступаўшыя гаварылі аб шмат якіх асаблівасцях Коласа, аб якасцях яго, як чалавека, паэта і грамадзяніна. Выступаўшыя гаварылі, што яны давяраюць Коласу, як кандыдату, паважаюць яго, любяць і цэняць.

За што?

Можа гэтае самае «за што» і не зусім да ладу ў нашым нарысе. Няма чаго пытаць, калі само пытанне такое яснае, зразумелае і даўным-даўно вырашанае, вырашанае самім жыццём, народам, усёй паэтычнай і грамадскай дзейнасцю чалавека, якога паважаюць, якому аказваюць пачэснае і высокае давер'е.

Якуб Колас нарадзіўся ў 1882 годзе ў вёсцы Мікалаеўшчыне, што над Нёманам, у беднай сям'і лесніка. Суровае і непрыглядное было жыццё лясніковай сям'і. Без уласнага кутка, без уласнай зямлі сям'і прыходзілася пераязджаць з месца на месца ў пошуках хлеба, у пошуках працы. Запаветнай марай бацькоў быў кавалак уласнай зямлі. Толькі свая зямля, на іх думку, магла пазбавіць іх ад нягод жыцця, ад залежнасці ад панскай няволі, ад панскіх капрызаў. Шырокія, падрабязныя звесткі аб гэтым перыядзе дзіцячых год паэта мы можам знайсці ў яго паэме «Новая зямля», прасякнутай шматлікімі аўтабіяграфічнымі данымі. З самага ранняга дзяцінства Колас добра пазнаёміўся з умовамі тагочаснага жыцця, яго пеналаджанасцю, вялікімі несправядлівасцямі, жорсткай эксплаатацыяй чалавека чалавекам. Усё гэта балюча крапала чулае, успрыймальнае сэрца дзіцяці і прымушала задумвацца над «прычынамі ўсіх прычын», над прычынамі ўсіх тых з'яў, якія ўспрымаліся ўсімі акружаючымі, як упаўне натуральныя, упаўне законныя, навечна ўстаноўленыя ні кім іншым, як самім богам.

Жыццё хлопчыка Якуба праходзіла звычайна ў лесе, у полі, на лоне прыроды сярод «птушыных спеваў і воўчага завывання», як гаворыць сам пісьменнік. Яго захапляла і радавала хараство роднай прыроды, багацце красак, лугоў, жытнія хвалі на полі, таемныя шолахі бароў, дзівоснае, казачнае жыццё зялёнай дубровы, срэбныя пералівы рэк, чаруючая песня жаўранка, дзятлаў стук, барсучыны след на лясной сцежцы. Яго дзівілі хвалюючыя змены года, да слёз радавалі першыя веснавыя ручайкі, прымушала задумвацца залатая цвецень восені. Хлопчык палюбіў прыроду, навучыўся чытаць у ёй, як у добрай казачнай кнізе, навучыўся прыслухоўвацца да яе голасу. І мы не выдадзім сакрэту, калі скажам, што Колас і цяпер да слёз радуецца першаму веснавому грому, першай веснавой прагаліне ў лесе, першаму баравіку, першаму ўсплёску шчупака. Мы назіралі, як суровее Колас, якім пахмурным робіцца ён, калі ў жаркую летнюю пару доўгі час не паказваюцца дажджавыя хмары, калі смягне зямля ў доўгім чаканні навальніцы.

— Смягне зямля і я смягну... — звычайна гаворыць тады сумны Колас.

Гэтая любоў да роднай прыроды, багатыя назіранні за ёй дапамаглі Коласу, як пісьменніку, стаць адным з лепшых прыродаапісальнікаў.

Але мы ўхіляемся крыху ад тэмы.

Маленькі Колас вучыўся спачатку дома, потым у вясковай школе. Яго цікавілі і хвалявалі народныя песні, казкі, паданні, якія ён чуў ад маці, ад вясковых людзей, ад ляснікоў. У школе ён упершыню пазнаёміўся з творамі найлепшых рускіх пісьменнікаў—Пушкіна, Гогаля, Лермантава. Мастацкія вобразы глыбока хвалявалі яго. Маленькі Колас прабуе пісаць першыя свае вершы і, набраўшы адчайнай мужнасці, паказвае іх першаму свайму крытыку — бацьку. Не вялікай, дзякуй, быў ляснік, але першыя паэтычныя спробы сына адобрыў.

Скончыўшы вясковую школу, Колас дзве зімы самастойна рыхтуецца да паступлення ў Несвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую і канчае ў 1902 годзе і становіцца вясковым настаўнікам. Пакутнае, не лёгкае было жыццё настаўніка ў царскай Расіі. Былі над ім панам і богам і земскі начальнік, і ўраднік, і поп, і валасны пісар. Усе яны ва ўсе вочы глядзелі каб не сступіў куды настаўнік убок ад афіцыйнай і скуднай праграмы навучання, каб не пераступіў ён і кроку далей сваіх «аз» і «букі», каб не раскрыў ён, крый божа, праўды сялянам на скупое, беспрасветнае жыццё, каб не сказаў ён, барані божа, слова хулога па адрасу цара-бацюшкі і яго верных прыслужнікаў.

А жыццё было чорным, як ноч. Гібелі бедныя вёскі. Паны і кулакі пускалі з жабрацкай торбай тысячы бязземельных сялян. Бязлітасна распраўляўся ўраднік з кожным, хто асмельваўся сказаць слова праўды. Як зграя чорнага варання, насіліся па вёсках царскія служкі — чыноўнікі. Адурманьвалі сялянскія галовы папы і царскія манапалькі. Народ падвяргаўся суроваму праследаванню, цяжкаму гнёту—соцыяльнаму і нацыянальнаму. У народа адбіралася права гаварыць на сваёй роднай мове. У страху перад рэвалюцыяй бацюшка-цар абманваў народы былой імперыі канстытуцыяй.

Аб гэтай канстытуцыі трапна напісаў Колас, які ў той час з галавой акунаецца ў актыўную грамадска-палітычную работу супроць царскага самадзяржаўя.

Канстытуцыю далі,
Адчынілі дзверы
І... ў астрог нас павялі
І таўкуць без меры.

І ўжо без усякай далікатнасці адзываецца ў сваім вершы Колас аб цару-бацюшку:

Да чаго-ж мы дажыліся!
Эх, падвёў ты нас, царок!
Каб табе даў бог на старасць
Лапці, торбу і мяшок.

Паэт, напісаўшы свой першы верш у 1906 годзе, даў багата твораў, заклікаўшых тагочаснае сялянства да актыўных выступленняў супроць спрадвечных ворагаў працоўных, супроць цара і паноў.

Не, не будзе нам жыцця,
Як паноў не перавешаць,

піша ён у вершы «Наша доля» у 1907 годзе. У вершы «Мужык», напісаным у 1909 годзе, паэт гаворыць:

Я—мужык, не чую звону,
Толькі-ж ёсць мяне чарвяк:
Ці не брэша поп з амбону,
Што цару бог даў карону?
Ой, не, мусібыць, не так!
Я — мужык, а гонар маю,
Гнуся але да пары.
Я маўчу, маўчу, трываю,
Але скора загукаю:
«Стральбы, хлопчыкі, бяры!»

Усю мастацкую творчасць сваю, усю грамадскую і палітычную работу Колас звязвае з інтарэсамі працоўнага народа, з яго думамі, надзеямі, марамі. За гэтую работу паэт атрымаў ад царскага ўрада тры гады турмы. Так рабіла царскае самадзяржаўе з усімі тымі, хто ішоў супроць яго, хто выступаў у абарону народных інтарэсаў, хто змагаўся за лепшую будучыню народа.

Зразумела, што творчыя здольнасці паэта не змаглі знайсці поўнага свайго росквіту ва ўмовах царызма. Толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі поўным цветам закрасаваў паэтычны талент Коласа, напісаўшага багата самых разнастайных твораў — паэтычных і ў прозе. Багатая совецкая рэчаіснасць, шчаслівае, поўнакроўнае жыццё совецкіх людзей, велічны размах соцыялістычнага будаўніцтва, росквіт гаспадаркі і культуры роднай рэспублікі і ўсёй нашай радзімы—вялікага Совецкага Саюза, грандыёзныя перамогі совецкага грамадства, — усё гэта натхняла і натхняе паэта на стварэнне глыбока-мастацкіх і хвалюючых твораў.

Я вітаю вялікі, шырокі разгон
Нашых дзён маладых,
Гоман творчасці іх...
Дык ярчэй-жа гары, сонца радасных дзён!

піша ён у 1933 годзе. Паэт вітае калгасную вёску, ён горача заклікае яе ў 1930 годзе ў вершы «Калгаснае»:

«Мая зямля», «мой поплаў, наша»,
«Мой луг», «мой конь», «мае каровы» —
Злінялыя старыя словы;
Пара, пара даць сэнс ім новы:
Змяніць іх час на «наш» і «наша»!

Паэт жыва адгукваецца на любую падзею ў краіне, яго хвалюе і стаханаўскі рух, і перамогі нашых сокалаў-лётчыкаў, адчыненне Днепрагэса, сельскагаспадарчая выстаўка, любая падзея, малая і вялікая, якая гаворыць аб творчым росквіце народа, аб яго мужных перамогах. Паэт горача ненавідзіць ворагаў народа і ў сваіх творах кляйміць іх гнусныя справы, пасылае ім суровыя праклёны. Паэт не забываецца на сваіх землякоў, пакутваючых пад белым арлом. Ён прысвячае працоўным Заходняй Беларусі не адзін палымнеючы верш і ў гэтых творах выказвае вялікую ўпэўненасць у канчатковай перамозе працоўных, у няўхільнай пагібелі панскай улады. Вось піша ён у 1927 годзе:

...Няхай «ад мора і да мора»
Жыве ў закручаных мазгах, —
Браты! Мінецца ліха-гора
І панскі шал затхнецца скора,
Бо стукне молат па панах.

І молат стукнуў, стукнуў у 1939 годзе так удала, што паляцелі ў розныя стораны панскія шапкі: і разам з імі панскія галавы. На вызваленую зямлю панам ужо ніколі не вярнуцца, крывавая ўлада іх разбіта навекі. Вялікім пафасам, глыбокаю радасцю гучаць словы Коласа з яго пісьма да народа Заходняй Беларусі.

«... Рука гісторыі падымае вас на ясныя вышыні жыцця. У гэтыя хвалюючыя дні вы павінны з адкрытым сэрцам, смела і свабодна выявіць сваю волю, сказаць свае слова і азначыць сваю дарогу і месца сваё ў жыцці — вы павінны выбраць сваю ўладу, мужную, чэсную, разумную, дальнавідную, злітную з працоўным народам, тысячамі карэнняў ўросшую ў народную глебу. Такая ўлада ніколі не пакіне народ, не пабяжыць ад яго ў цяжкую часіну выпрабавання, бо такая ўлада — гэта сам працоўны народ, а народ вечны, народ бяссмертны. Вось чаму я ні на хвіліну не сумняваюся ў тым, што вы на вялікім усенародным сходзе голасна і дружна скажаце:

Няхай жыве вялікая, сапраўды народная совецкая ўлада, бо яна адна забяспечвае народам сапраўднае шчасце на зямлі, яна адна вядзе іх па шляху прагрэса, мірнай творчай працы на карысць народа, па шляху дружбы і салідарнасці ўсіх народаў, па шляху росквіту іх творчых сіл.

Дык няхай жывуць Советы!»

Народы Заходняй Беларусі з'ядналіся з народамі Совецкай Беларусі, сонцам Сталінскай Канстытуцыі асвятліўшы свае новыя шляхі. Пішучы аб Сталінскай Канстытуцыі ў 1936 годзе, паэт гаварыў:

...Пройдзен шлях вялікі, трудны,
Мы на радасным прывале,
На тым сходзе многалюдным,
Дзе дунае імя Сталін.
...Правадыр наш, добры геній!
Праз вякі, праз часаў далі
Усім новым пакаленням
Сімвал шчасця будзе — Сталін.

Шлях вялікі пройдзен Коласам, чалавекам, паэтам і грамадзянінам. Совецкія дні, сталінская эпоха стварылі для яго ўсе ўмовы для поўнага росквіту творчых сіл, паэтычнага таленту. Якуб Колас акрамя творчай работы займаецца і шырокай грамадскай дзейнасцю, актыўна працуе ў Акадэміі навук, у Саюзе совецкіх пісьменнікаў, прымае блізкі ўдзел у любой палітычнай кампаніі ў нашай краіне.

Усё сваё жыццё, свае сілы, свае здольнасці ён аддаў і аддае на карысць працоўнага народа, на шчасце і радасць нашай вялікай радзімы. За выдатныя поспехі ў будаўніцтве нашай соцыялістычнай культуры, урадам СССР ён узнагароджан ордэнам Леніна. Яшчэ раней яму нададзена была годнасць народнага паэта і ён беражэ гэтую годнасць, сумленна несучы высокія абавязкі і задачы народнага паэта.

Вось за ўсё гэта,—за чэсную, самаадданую працу, за кроўную сувязь з народам, за адданасць нашай вялікай радзіме і ўсёй нашай бальшавіцкай справе працоўны народ любіць і паважае Якуба Коласа і вылучае яго кандыдатам у свае органы ўлады.

Аказанае паэту давер'е будзе поўнасцю апраўдана.

Якуб Колас надзейны і дастойны кандыдат.

Аркадзь КУЛЯШОЎ

Паэзія Максіма Танка

Гэта не крытычны артыкул, а толькі ўсяго першыя ўражанні, раптоўныя думкі, выкліканыя радасным знаёмствам з новым, непаўторным вобразам юнака, створанага паэзіяй Максіма Танка.

Хто ён такі, гэты юнак? Звычайны хлапец з вёскі Заходняй Беларусі, якому рана давялося адчуць сацыяльны і нацыянальны прыгнёт і пра ўсё гэта ярка і арыгінальна расказаць людзям. У мяне могуць спытаць: што свежага і арыгінальнага можна стварыць пасля вершаў Купалы і Коласа, якія так поўна і ярка выказалі сваёй паэзіяй усю крыўду і нядолю народа дваццаць, дваццаць пяць год таму назад у вельмі блізкіх умовах жыцця, ва ўмовах царскай Расіі? Так, умовы жыцця ў царскай Расіі і ў панскай Польшчы былі вельмі блізкія. Але... але ўсё-ж такі жыццё ніколі само сябе не паўтарае. Дадзім слова паэту:

Песта схіліўшыся месіць старая
З жытняй мякінай ў дзяжы.
— Хоць бы да першых растопаў
дажыць!—
Хворы на ложку ўздыхае.
Дымам счарнелыя бэлькі заслала.
У рамках сумуе Купала.
А ў кутку абразы цудатворцаў
Даўна ад дыму сляпых.
Б'ець ім паклоны за дождж, за снапы
Ноччу старая да сонца...
Мала змянілася, вёска мая ты!
Болей мо' трохі лапцей.
Болей на плечах ў старых і ў дзяцей
Голага цела і латаў...

Сацыяльны і нацыянальны прыгнёт у былой панскай Польшчы, у параўнанні з царскай Расіяй дайшоў да гіпербалічных памераў. З беззямельнага сялянства Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны згадзялі па тры скуры за дзень. Сістэма падаткаў і штрафаў дайшла да таго, што дзяржаве селянін плаціў штрафы за ўсё, нават за тое, што па страсе пуні вырасла спаблінка тытуню. За чытанне вершаў Коласа ці Купалы беларускі сялянскі хлапец павінен быў адседзець у турме, ці зноў-такі плаціць штраф. І атрымалася так, што ўжо не адзінкі, а цэлыя сем'і, цэлыя вёскі ішлі ў турмы. Такая нечуваная нядоля — ужо не проста паўтор сацыяльнага і нацыянальнага гнёту былой царскай Расіі, а нешта большае.

У гэтым першая асаблівасць умоў, у якіх давялося жыць і тварыць маладому сялянскаму паэту Танку. Польскія паны як найманней заціскалі ярмо сацыяльнага і нацыянальнага ўціску на шыі прапоўных яшчэ і таму, што ў панскім сэрцы, побач з нікчэмна-смешным шляхецкім гонарам, вельмі добра ўжываўся страх перад народам, перад немінучым народным паўстаннем. Баяцца-ж было чаго! — з панскай Польшчай межаваў Савецкі Саюз, у якім народы не зналі ні сацыяльнага ні нацыянальнага ўціску, а ад прыгнечанага народу «крэсаў усходніх» цяжка было схаваць гэту праўду.

У гэтым другая акалічнасць, якая дадатна адбілася на творчасці Танка, надаўшы ёй свежы арыгінальны тон.

Усё-ж такі вялікія цяжкасці паўставалі перад маладым паэтам — не паўтарыць Купалы і Коласа, бо, не сакрэт, вершы іх вывучваліся напамяць прыгнечаным народам і гучэлі, як вельмі блізкія, вось-вось напісаныя. І гэтых цяжкасцей Танк не мінуў, першыя яго вершы з цыклу «Чорныя скібы», «Акварэлі» пад вялікім уплывам народных паэтаў.

Чытанне, а тым больш пісанне вершаў на беларускай мове Максіму Танку, як і іншым сялянскім хлапцам яго ўзросту, дазвана не было. Давялося трапіць у турму і... знойдзены новыя арыгінальныя фарбы, смелыя думкі і параўнанні. Сталася так, што само жыццё паклапацілася паказаць паэту свае найбольш тыповыя з'явы, свае непаўторныя людскія слёзы, крыўды і надзеі. Страўся юнак у турэмнай камеры з хворым таварышам, шчыра аб усім гаварылі з ім, пасябравалі, аднак... раніцой таварыш памёр. І як маланкай асвяціла юнака-паэта смерць дарагога чалавека. Ён шэпча яму словы, ад якіх вее дзіўнай, мужнай чыстатой юнацкіх пачуццяў. Ён шэпча памёршаму аб тым, што «далёка на Палессі зацвілі сасонкі ціха ў лесе», паэт шэпча памёршаму: «хоць ты і спіш», — але «я не напішу тваім бацькам», бо сорамна ў сэрца лезці з кіпцюрамі. Бо бацькі:

Можа калі глянуць на гасцінец:
— Сын ці не?
няхай:
У кожным падарожным,
На гасцінцы шэрым,
Паміж жоўтых, чорных, белых валяін
Вечная надзея застанецца ім.

Перажываючы боль за смерць таварыша, паэт усё-ж за лепшае лічыць пакінуць людзям надзею — на першы раз, хоць на зварот сына. А потым? Потым паэт кіне ім праменістыя словы:

Час ужо сцягам разгорнутым шумець
Над гарадамі, над бязмежным полем.
Зрабіць жыццём—агонь, а зяннем —
нават смерць.
Маланкай азарыўшай полюс.

Не падаць, не ныць — вось той новы, свежы тон, які гучыць у вершах Танка. Нават тады, калі паэт, седзячы ў турме, сумуе па вясне, яго верш па-новаму асвятляе становішча зняволенага. Разам з сумам, у вершы чуецца і затоеная злосная іронія па адрас турэмшчыкаў:

Паслухайце, вясна ідзе.
Звініць ў маім акне жалеза.
З вінтоўкай стражнік ноч і дзень
Вартуе куст пахучы бэзу.

Цяжка адразу знайсці такія словы, каб расглумачыць красу гэтых радкоў: свежыя яны і таму, што стражнік вартуе не вязняў, не турму, а ўсяго толькі... куст бэзу, і таму, што стражнік ад зняволеных вартуе вясну, якая вабіць, кліча да сябе і гарыць за турэмным акном «максім, пахучым, сінім агнём» бэзу, які «на дрот калючы, на муры, як хустку, полымя ускінуў».

Ёсць у Танка верш пра спатканне бацькі з вязнем-сынам. На сумным фоне спаткання, праз абыдзённую размову пра ніву, сенажаць, раптам выбухае глыбока затоеная ў грудзях зняволенага сына вера ў лепшую будучыню, такая ўпэўненасць у свае маладыя сілы, што стары бацька, які нёс сваё гора і крыўду да вастрожных сцен, замураваўшых яго сына, загараецца (хай сабе на хвілінку!) той-жа маладой сілай і надзеяй, разумее сына, верыць, што такія юнакі, як яго сын, скрышаць і вастрожныя муры і тую нядолю, што пануе па сялянскіх хатах. Верш пачынаецца так:

— Ну, што-ж, кажы што ў вас чуваць?
Пачаў стары пра сенажаць,
Успомніў жыта і авёс...
А вочы... мокрыя ад слёз.
Бацька спачувае сыну:
— Нічога, мы-то жыць жывём,
Вось ты тут сохнеш за мурам...
Я ў торбе сухароў прынёс...—
А вочы... мокрыя ад слёз...

Сын, можа, ад таго, што яго блізка і сурова кранула спачуванне бацькі і, можа, уяўляючы крыўду і пакуты бацькі большымі за свае, пранікнёна кажа:

— Не плач! Мы вернемся вясной
І ў поле выйдзем грамадой...
... З сяўнёю поўнаю зярнят
Нас выйдзе шмат, як цёмны бор.
На скібы чорныя разор. —
Стары, я бачу, верыць мне
І сам гавора аб вясне,
І неяк відучы падрос,
Хоць вочы... мокрыя ад слёз...



Максім ТАНК

Я не буду тут разбіраць такія вершы Максіма Танка, як «Дзед і шчупак», «Песня кулікоў», «З каласамі», «Над Прыпяццю», «Выраі», «А ў полі вярба», толькі зазначу, што ўсе яны маюць у сваёй аснове глыбокае лірычнае пачуццё, юнацкую прагу і любоў да жыцця, аптымізм. Як сталася, што любоў да жыцця, вера ў лепшае, яснасць думкі і пачуцця заваявалі сабе ў паэзіі Танка першае месца, сталі асноўнымі найбольш характэрнымі рысамі яе, надаўшы ёй непаўторную свежасць? З якіх крыніц чэрпаў паэт гэтую любоў — трывалую і ясную? У народа, у жыцця, — можна адказаць, але гэта будзе адказ яшчэ няпоўны. А народ, хіба яму жылося весела? А жыццё, хіба яно было не змрочнае? Народ цярпеў нечуваныя здзекі, жыццё было цямнейшае за ноч. Больш за ўсё каралі паны простага чалавека тады, калі ён сэрцам хіліўся да краіны сацыялізма, слухаў прыпаўшы да зямлі яе песні, слухаў праз радыё яе словы. Чалавека кідалі ў турму за адну цікавасць да жыцця ў Савецкім Саюзе. Бачачы такі страх паноў перад жыццём, народ верыў у сваю праўду, меў сваю, хай сабе захаваную глыбока, чалавечую гордасць. Вось з якой крыніцы брала паэзія Максіма Танка любоў да жыцця, яснасць і мужную мэтапакіраванасць пачуцця. Тут дарэчы будзе прывесці верш Максіма Танка «Матыль»:

Дзень залаты
цёплым сонцам залітЫ.
Лётаў матыль
сінякрылы над жытам.
Лётаў, як сон,
над калоссямі нізка,
Як перазвон,
над малою калыскай.
Слёзы мігцяць
ад тугі і бяссілля:
Хоча дзіця
матылёвыя крылля.
Маці-жняя
папяшае малога:
— Доля твая,
яшчэ спіць на дарогах...
Я вось дажну
паласу, сіраціна,
І раскажу
пра палёт матыліны.
Будзеш і ты,
сынку, лётаць высока...
Дай зараблю
вось на хлеб табе, сокал...

Вось яна, мара маці, — бачыць сваіх дзяцей шчаслівымі, якія будуць лятаць высока... як лятаюць там, на Ўсходзе. Так і ўяўляецца гарачы летні дзень, шырокае спелае панскае жытняе поле, на ім маці-жняя і калыска з дзіцём... а зусім недалёка, усяго якіх крокаў дзвесце, за пагранічнымі слупамі... такое-ж шырокае поле, толькі не панскае, а над ім недзе, на спавітым летняй смугою небасхіле ляціць савецкі самалёт і вядзе яго дачка шчаслівай маці «дачушка Алеся»:

Самалётавым крыллем
Воблакі калыша.

Ці не слаўныя справы нашых лётчыкаў-сокалаў урываліся ў вобразы Максіма Танка, калі ён гаварыў, што час ужо зяннем зрабіць — нават смерць, зрабіць яе «маланкай, азарыўшай полюс»?

Яшчэ адзін верш, які сцвярджае гэтую думку. Паэт піша, што «пад дзяругаю вастрожнай» панясе вольныя песні, рассее іх і па дарогах і ў сэрцах людскіх, і яны зазвіняць каласамі ў сінім полі.

Стальная зрэжа іх машына.
У стальныя звонкія цапы
Падасць іх весела дзяўчына...
Сны-песні, зжатыя ў снапы.

Тут мара аб тым, каб на палі Заходняй Беларусі прышла сталь, машыны... Тыя самыя машыны, якія на Ўсходзе жнуць жыта, а вясёлыя дзяўчаты вяжуць яго ў снапы.

Дыханне нашага жыцця ўвайшло ў паэзію Максіма Танка, як усведамленне веры ў выніку барацьбы, як упэўненасць у свае сілы, у сваю чалавечую гордасць, гордасць будучага гаспадара зямлі. Паўтараю, у гэтым яе найбольшая поўнакроўная свежасць і своеасаблівасць.

Юнак-паэт заблукаў на могільнік. Ляжаць там пахаванымі не яго браты, не людзі мазаля, якія ці «на дарогах зложылі галовы», ці ў невядомых курганах. Тут могільнік паноў, што на невяточа дзе зарытых касцях бедных людзей будавалі сабе светлае жыццё і... пасля смерці пакінулі памяць аб сабе на мармуровых плітах:

Гранітныя пліты і мармур бялее —
Не чорных касцей спрацаваных начлег.
Здаецца, на кожным такім маўзалеі
Свой звонкі павесіў-бы смех.

І паэт смяецца і над вякамі мінулага панскага панавання, і над цяперашнімі панамі і іх панаваннем. А чаму не смяяцца яму, калі ён ужо адчувае сваю перавагу над імі, ён і разумнейшы за іх, і здальнейшы, і больш любіць жыццё. Хутка адбудзецца замена ролей — не яны, а ён будзе з'яўляцца гаспадаром жыцця. Верш напісан у 1937 годзе, а праз два гады там, дзе пісаліся гэтыя радкі, не засталося і панскіх сядоў.

У дарэвалюцыйных вершах Купала і Колас, характарызуючы прыгнёт і крыўду беларускага народа, пісалі аб магутным жаданні беларусаў — «людзьмі звацца», а ў вельмі блізкіх умовах прыгнёту і здзекаў сялянскі хлапец з «крэсаў усходніх» заявіў ужо аб сваёй чалавечай перавазе над прадстаўнікамі пануючых класаў.

З болем і жалем бачыць сялянскі хлапец, як ненавісныя яму ўладары жыцця, каб яшчэ тужэй набіць сабе кішэні, бязлітасна рабуюць краіну, высякаюць лясы, пушчы, губяць красу і маладосць:

На захад ідуць цягнікі, —
Лён, жыта, сасна і бяроза...
Гляджу, і гляджу з-пад рукі,
Як моладасць нашу вывозяць.

Гэты жаль і гэты боль жыў у народзе. У восенскую ноч паэт чуе яго ў словах маці, у словах 100-гадовага дзеда, які, лежачы на дашчатых нарах, «успамінае жыццё, што мінула ўчора»:

І, як памяць сівая далёка ахоне,
Ён гавора з тугой аб гушчарах глыбокіх,
Бы памінкі спраўляе па соснах высокіх,
Па лагох, па ласіных затоптаных
тропах...

А моладзь? Моладзь, гонячы па рэчцы ссечаны і звязаны ў плыты лес, загадвае:

Гэй, воды, быстрая рака,
Назад лепш павярні!
На пнёх не марыць аб красе,
Гарыць жывіца ран.
Калі такія ты нясеш
Дары за акіян.

І быццам, зноў звяртаючыся да ракі, яны пагражаюць:

Узамен тавар дадзім другі, —
Нямала тысяч тон! —
Вяровак скручаных тугіх,
Стальных сякераў звон!

Хай мне даруе аўтар і чытач: замест радка «стальных сякераў звон!» у кніжцы цэнзура паставіла кропкі... Я-ж, не ведаючы арыгінала, аднаўляю гэты радок, і, як мне здаецца, без вялікай памылкі.

З усіх вершаў паўстае вобраз сялянскага хлапца-юнака, разумнага, смелага ў сваіх думках і пачуццях — вобраз самога паэта. Ён то лірычна-задуменны, пазіраючы на адлёт у вырай гусей, ідучы змораным па пясчанай дарозе, не забывае паслаць ім кліч «Шчаслівай дарогі!», то з цёплым гумарам расказвае нам гісторыю пра дзеда, якога апукаў шчупак, не трапіўшы на дзедавы прыманкі—зерні-зоры, то гнеўна-бунтоўны кідае заклік біць паноў і звяртаецца да возера Нарач:

Люблю твае буры, твае навальніцы,—
У іх чую, як у песнях, жыццё
маладое...
І хочацца блізка грудзьмі прытуліцца
Да чорных, ад гневу магучых прыбояў.

Сам паэт песню сваю характарызуе так:

Нашу песню не раз грызлі голад з сухотамі,
Не было нават ранаў калі загаіць.
Станавіліся, ведай, на грудзі падкутымі
ботамі
І чужынец-гандляр, а найгорш — гэта
юды свае.

Вобраз паэта будзе няпоўны, калі не сказаць, як ставіўся ён да «юдаў сваіх», да буржуазных нацыяналістаў, якія намагаліся адарваць паэта ад народа, ад барацьбы. Паэт гнеўна заявіў ім:

Я не магу вас песняй цешыць,
З абмытых бурамі эстрад,
Хоць меў-бы пенсію штомесяц
І спакайней я жыў-бы шмат,
. . . .
А так ўжо сёння я не першы,
Прышоўшы зморана дамоў,
Да позняй ночы мыю вершы
Ад вашых пальцаў, ад слядоў.

На гэтым я і скончу свае ўражанні і думкі, выкліканыя паэзіяй Максіма Танка. Перад тым, як скончыць, хачу зазначыць, што ёсць у паэзіі Танка і свае слабыя бакі, якіх паэту трэба асцерагацца. Паэт час ад часу пачынае кідацца ў нейкія, нікому незразумелыя пошукі, дзе «журавініц» песняй Беларусь», «крынічыць» і г. д. Уяўляюцца чужароднымі для паэзіі Танка такія вершы, як «Заснулі стрэхі, купалы і ліпы», «Хмараў чаўны наплываюць», «За пацалункі і за вочы», «Белая грэчына ў полі», — у гэтых вершах голас паэта гучыць расслаблена, вяла, губляе сваю свежасць і абаяльнасць. Танк—пераважна лірык. Мусіць таму паэмы яго не пакідаюць уражання эпічных твораў — у іх аўтар не стварае вобразы герояў, а гаворыць за іх сваёй лірычнай моваю.

Танк — паэт арыгінальны, таленавіты і жыццёздольны. Хочацца пажадаць яму новых, яшчэ большых поспехаў на аснове новага, сацыялістычнага жыцця.

За аўладанне марксісцка-ленінскай тэоры[і]

* * *

ГЛЫБОКА, ШТОДЗЁННА ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ ПАРТЫІ

Дзякуючы паўсядзённым клопатам і ўвазе партыі Леніна—Сталіна і вялікага правадыра народаў І. В. Сталіна да культурнага і палітычнага росту шырокіх мас працоўных, мы атрымалі выдатную навукова-палітычную працу — «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Гэтую кнігу, якая з'яўляецца разгорнутай праграмай марксізма-ленінізма, палюбілі і па вартасці ацанілі не толькі працоўныя нашай вялікай краіны, але і працоўныя ўсяго свету.

Шырока разгарнулася ў нашай краіне вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Слесар і прафесар, лётчык і актор, калгаснік і інжынер — усе зрабілі яе сваёй настольнай кнігай.

Праўда, прысутнічаючы ў якасці дэлегата на другой усебеларускай канферэнцыі работнікаў мастацтваў і ўважліва прыслухоўваючыся да выступленняў таварышоў, прыходзіцца, нажаль, канстатыраваць, што не ва ўсіх нашых калектывах дастаткова разгорнута вывучэнне гісторыі партыі. Да гэтых калектываў адносіцца, у прыватнасці, і тэатр музкамедыі БССР.

Для работнікаў мастацтва вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» мае велізарнае, рашаючае значэнне. Нельга стварыць цікавы, поўнакроўны і праўдзівы вобраз, яркі і рэалістычны мастацкі твор, і значыць, спрыяць росту савецкага мастацтва, не вывучаючы марксісцка-ленінскай тэорыі.

Сям'я работнікаў мастацтваў Беларусі вырасла. Я гавару аб таварышах вызваленай і далучанай да БССР Заходняй Беларусі, якія прагнуць далучыцца да савецкага мастацтва. Наш абавязак дапамагчы ім у гэтым. Перадача ім нашага светапогляду, нашага вопыта і ведаў, нашага майстэрства, адточанага высокім палітычным узроўнем і культурай, з'яўляецца для нас пачэснейшай і важнейшай задачай.

Работнікі мастацтва, карыстаючыся вялікай увагай, ласкай і клопатамі з боку нашай партыі і ўрада, павінны быць перадавым атрадам савецкай інтэлігенцыі не толькі ў культурных адносінах, але і ў палітычных. Глыбокае і штодзённае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» ім у першую чаргу ў гэтым дапаможа.

А. АСТАХАЎ.
Актор-рэжысёр тэатра музкамедыі БССР.

ВЯЛІКАЯ ЗБРОЯ БОЛЬШЭВІЗМА

Выхад у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» быў вялікай падзеяй у справе ідэйнага выхавання шырокіх мас Савецкага Саюза. Асаблівае значэнне мае гэты падручнік для савецкай інтэлігенцыі і, у прыватнасці, для работнікаў мастацтва. Сапраўдны мастак не можа поўнакроўна тварыць, не ведаючы законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы, рухаючых сіл рэвалюцыі. «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» узбройвае гэтымі важнейшымі ведамі.

На падставе пастановы ЦК ВКП(б) аб перабудове прапагандысцкай работы партарганізацыя Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра БССР у 1938 годзе ўсю сваю прапагандысцкую і агітацыйна-масавую работу карэнным чынам перабудавала. Замест існаваўшых 3 гурткоў быў пакінут толькі адзін. Асноўны ўпор у прапагандысцкай рабоце быў узят на індывідуальнае вывучэнне гісторыі ВКП(б). Былі арганізаваны лекцыі ў адпаведнасці з раздзеламі «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», лекцыі па творах В. І. Леніна «Что такое «друзья народа» и как они воюют против социал-демократов?», «Что делать?» і «Шаг вперед, два шага назад». Сістэматычна працавала кансультацыя ў дапамогу вывучаючым гісторыю партыі.

Па другому раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» была праведзена тэарэтычная канферэнцыя, якая дала свае станоўчыя рэзультаты. Партарганізацыя склікала нарады індывідуальна вывучаючых гісторыю партыі для абмену вопытам і для вырашэння пытанняў, звязаных з індывідуальнай вучобай. Сёлета мы яшчэ не разгарнулі гэтай работы ў дастатковай меры. У самы бліжэйшы час мяркуецца арганізацыя рада лекцый па тэмах трэцяга і чацвертага раздзелаў «Кароткага курса». Таксама запланіравана правядзенне рада гутарак. Пачата падрыхтоўка да тэарэтычнай канферэнцыі па чацвертаму раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Улічваючы вопыт мінулага года, партарганізацыя прыме ўсе меры да хутчэйшага наладжвання вывучэння гісторыі ВКП(б) і лепшай пастаноўкі прапагандысцкай работы ў нашым калектыве.

М. КАГАН.

*

МАЯ НАСТОЛЬНАЯ К[НІГА]

Калі пачаў друкавацца ў «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» [...] лікім захапленнем чытаў гэты [...] ны дакумент барацьбы і перам[ог] [...] камуністычнай партыі. Тады я адразу р[а]шыў паступова і грунтоўна авалодаць гэтым геніяльным тварэннем. І вось, у часе летняга адпачынку ў гэтым годзе я пачаў вывучаць па раздзелах гэты гістарычны дакумент. І, калі я другі раз чытаў «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», а таксама дадатковыя матэрыялы, мне стала яснай сутнасць ідэй, якімі кіравалася партыя ў сваёй барацьбе.

Мая мэта—цалкам авалодаць філасофіяй партыі, каб бачыць жыццё ва ўсёй яго шматвобразнасці, быць высокасвядомым будаўніком камунізма.

Нам, акторам, дэтальнае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» многа дапамагае ў справе стварэння мастацтва —сацыялістычнага па зместу, нацыянальнага па форме.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» з'яўляецца маёй настольнай кнігай.

С. БІРЫЛА.
Засл. арт. БССР.

—○—

ВЯЛІКАЯ КНІГА ЖЫЦЦЯ

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» — мая настольная кніга.

Гэтая кніга, якая надзвычай ясна і проста паказвае шлях камуністычнай партыі, — вучыць мяне яшчэ больш моцна цаніць прыгожае жыццё, за якое калісьці ў сібірскіх астрогах, на франтах грамадзянскай вайны недарма пралівалі кроў лепшыя сыны народа.

Пачэсная задача для пісьменніка, паэта — паказаць у мастацкіх вобразах слаўных тварцоў бальшавіцкай партыі.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» ідэйна ўзбройвае, навучае канкрэтна і ясна мысліць і глыбока вывучаць творы Леніна і Сталіна.

Мне, як маладому кандыдату партыі, які рыхтуецца стаць членам ВКП(б), асабліва важна і цікава вывучэнне гісторыі бальшэвізма.

Авалоданне бальшэвізмам — вялікая справа, якая мае выключнае значэнне для пісьменніка. Таму кожны з нас павінен больш глыбока вывучаць вялікую кнігу жыцця—«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

Эдзі АГНЯЦВЕТ.

80-годдзе з дня нараджэння Коста Хетагурава

Народны паэт Осеціі

Сёння шчаслівая Савецкая Осеція і ўсе народы нашай краіны адзначаюць 80-годдзе з дня нараджэння вялікага сына осецінскага народа, асновапаложніка осецінскай літаратуры і літаратурнай осецінскай мовы — Коста Хетагурава.

Народны паэт Осеціі, рэвалюцыянер-дэмакрат, Канстанцін Леванавіч Хетагураў выступіў на грамадскую арэну ў 80—90 годы мінулага стагоддзя.

«Смерць — за заклік да жыцця новага» — так характарызуе гэты час сам Коста.

Ён бачыў жудаснае прыгнечанне осецінскага народа і з песняй на вуснах кінуўся ў барацьбу з ворагамі народа. Вайстрыню, сілу баявой зброі надала творам Коста яго непарыўная сувязь з працоўным народам, з яго лёсам і надзеямі.

У 80—90 годы Коста быў душой і натхніцелем шырокага нацыянальна-вызваленчага руху сярод осецін і ўсіх горцаў Каўказа.

Уражаны цяжкім становішчам роднага народа, яго бяспраўем, беднасцю, цемрай, ён усю сваю кіпучую энергію і светлы розум аддае абароне осецінскай і горскай бедноты ад свавольства царскіх сатрапаў, ад прыгнёту алдараў і бадэлят. Ён складае свае палымнеючыя, абураныя вершы, якія ў рукапісах разыходзяцца па ўсёй Осеціі і нараджаюць у осецінскім народзе любоў да свабоды і імкненне пазбавіцца ад гвалту і прыгнечання. Кола грамадскіх інтарэсаў Коста вельмі шырокае. Ён становіцца цэнтрам увагі прыгнечанага осецінскага народа, яго імя робіцца сцягам барацьбы за свабоду. Але ён робіцца таксама цэнтрам увагі і царскай адміністрацыі, якая шукае выпадка, каб пазбавіцца ад «неспакойнага» Коста.

У 1891 годзе Коста высылаецца з межаў Терскай вобласці «за падбухторванне жывучых у Владзікаўказе осецін да падачы няправільных заяў і незаконных адрасоў».

У 1895 годзе Коста дамагаецца скасавання высылкі. Тады чорныя сілы сталі шукаць іншых спосабаў, каб пазбавіцца Коста. Лакей начальніка Церскай вобласці генерала Каханава, вядомы ўсяму осецінскаму народу сваімі подласцямі, палкоўнік Харанаў на станцыі Дарг-Кох робіць няўдалы замах на жыццё Коста.

У 1899 годзе Коста ў другі раз высылаюць з радзімы ў гор. Херсон, тэрмінам на пяць год. Да гэтага часу адносіцца выхад у свет зборніка осецінскіх вершаў Коста «Ірон фандыр». Пастаянныя праследаванні, жыццё ў выгнанні, матэрыяльныя нястачы падарвалі здароўе паэта. Ён захварэў на туберкулёз касцей, потым пачалося псіхічнае захворванне і 1 красавіка 1906 года ён памірае ў сяленні Георгіеўска-Осецінскім, цяпер — сяленне імя Коста Хетагурава, Карачаеўскай аўтаномнай вобласці.

Коста Хетагураў пакінуў вялікую літаратурную спадчыну. Ён пісаў на двух мовах — осецінскай і рускай.

Уступаючы на літаратурную арэну, Коста меў перад сабою чыстае поле — у яго не было папярэднікаў на радзіме. Таму ён звярнуўся да рускай класічнай культуры і да паэзіі Пушкіна, Лермантава, Кальцова, Някрасава. Асабліва блізкія яму Лермантаў і Някрасаў. Свабодалюбівы дух паэзіі Лермантава і яго спагадлівыя адносіны да горскіх народаў знайшлі водгук у творчасці Коста.

Яшчэ больш сугучна Коста паэзія вялікага прадстаўніка рускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай літаратуры — Някрасава.

Вялікую гістарычную ролю ў жыцці осецінскага народа і ўсіх горцаў Паўночнага Каўказа адыграла публіцыстычная дзейнасць Коста. Страсны палемічны тон, тонкі аналіз фактаў, уменне адрозніваць народныя інтарэсы ад гучных ліберальных фраз «аб меншым браце» — усё гэта з'яўляецца выдатнай рысай Коста-публіцыста.



Коста ХЕТАГУРАЎ.

Вялікай школай паэтычнага майстэрства для Коста быў таксама багаты і шматвобразны осецінскі фальклор. Коста ведаў, як ніхто ў той час, осецінскую народную творчасць. Ён цікавіўся ўсімі яе відамі: казкамі, гістарычнымі легендамі, прыслоўямі, пагаворкамі і г. д.

Паэзія Коста шматгранная. Тут і выкрыццё гнёта царскага самадзяржаўя, і думы горца-бедняка, тут і ваяўнічыя напевы, якія заклікаюць на барацьбу супроць рабства і гвалту. Творы Коста, якія вызначаюцца вялікім паэтычным майстэрствам, зрабіліся народнымі ў сапраўдным сэнсе гэтага слова. Няма ў Осеціі куточка, дзе-б не чыталі і не спявалі задушэўных вершаў і песняў паэта. У дні Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі працоўныя осеціны, кіруемыя вернымі саратнікамі вялікага Сталіна — тт. Орджанікідзе і Кіравым, ішлі на барацьбу супроць сваіх адвечных прыгнятальнікаў з баявымі песнямі Коста. І цяпер задушэўныя песні Коста пяюць на багатых калгасных палях заможныя калгаснікі.

Вялікі паэт Коста адначасова з'яўляецца і першым осецінскім жывапісцам. Дзякуючы яго кісці ў Осеціі ўпершыню зараджаецца станкавы жывапіс. Як ва ўсёй сваёй дзейнасці, так і ў жывапісу, Коста з'яўляецца змагаром супроць прыгнятальнікаў народа.

Коста глыбока верыў, што гвалту свавольству, эксплаатацыі чалавека чалавекам будзе пакладзен канец. Агні будучай рэвалюцыі мільгалі перад яго вачамі. Яму ўяўляліся карціны будучы крывавых баёў працоўнага чалавецтва з яго эксплаататарамі.

Ён кідае гнеўны папрок у твар усім, хто не адчувае болю народа, хто будуе свой дабрабыт на пакутах народа.

Мне вашего счастья не нужно, —
В нем счастья народного нет...
В блестящих хоромах мне душно.
Меня ослепляет их свет...
Их строило рабство веками,
Сгорают в них стоны сирот.
В них вина мешают с слезами...

Творчасць вялікага паэта прасякнута яркім інтэрнацыяналізмам. Ён урачыста абвяшчае:

Весь мир — мой храм, любовь —
моя святыня,
Вселенная — отечество мое.

Творы Коста былі і застаюцца каштоўным здабыткам осецінскага народа і яго гордасцю. Імя Коста было, ёсць і будзе дарагім для ўсіх народаў нашага неабсяжнага Савецкага Саюза.

—○—

ОРДЖАНІКІДЗЕ
СОЎНАРКОМ ПАЎНОЧНА-АСЕЦІНСКАЙ АССР

Юбілейнаму Камітэту Коста Хетагурава

З заходніх рубяжоў краіны сацыялізма горача вітаем народы Савецкай Осеціі з 80-годдзем з дня нараджэння асновапаложніка осецінскай мастацкай літаратуры, тварца осецінскай літаратурнай мовы, першага осецінскага мастака Коста Хетагурава.

Беларускі народ з глыбокай павагай ушаноўвае светлую памяць народнага паэта-рэвалюцыянера. Мужнае аблічча Коста, яго таленавітыя творы з'яўляюцца гордасцю шматнацыянальнай дружнай сям'і ўсяго савецкага народа.

Велізарныя перамогі сацыялістычнага будаўніцтва Осеціі ўвасабляюць лепшыя мары і чаянні вялікага песняра горскай бедноты, аддаўшага сваё жыццё ў барацьбе за шчасце народа. У дзень слаўнага юбілея шчыра жадаем рабочым, сялянам і інтэлігенцыі Савецкай Осеціі новых поспехаў у барацьбе за сацыялізм пад сцягам партыі Леніна—Сталіна.

Старшыня Соўнаркома БССР
КІСЯЛЕЎ.

ОРДЖАНІКІДЗЕ, Каўказ

Саюзу пісьменнікаў

Саюз савецкіх пісьменнікаў Беларусі горача вітае вас у сувязі са святкаваннем 80-годдзя з дня нараджэння Коста Хетагурава. Далучаем нашу радасць да ўрачыстасці осецінскага народа, які ўшаноўвае светлую памяць свайго вялікага сына, герагічнага змагара за шчасце працоўных.

Па даручэнню Праўлення —
М. ЛЫНЬКОЎ.

ОРДЖАНІКІДЗЕ, Каўказ

Саюзу пісьменнікаў

Прыміце наша шчырае прывітанне ў сувязі са святкаваннем васьмідзесяцігоддзя з дня нараджэння вялікага сына осецінскага народа Коста Хетагурава. Тварыце, апявайце цудоўную сталінскую эпоху, якая прынесла шчасце народам краіны сацыялізма. Вечная слава дарагому Коста, аддаўшаму за гэта шчасце свае шматграннае гераічнае жыццё і геніяльны талент.

ЯНКА КУПАЛА, ЯКУБ КОЛАС.

[У]СЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ [С]АЮЗА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ БССР

[Шчас]лівая сям'я працаўнікоў мастац[тва Са]вецкай Беларусі кожны дзень па[паўняец]ца новымі таленавітымі кадрамі, [...] народзе — невычарпальная кры[ніца ...] адзін толькі 1938—39 год пра[цоў]ны саюз працаўнікоў мастацтваў [вырас з] 1859 чалавек да 3500 чалавек. Лік студэнтаў, членаў саюза ў мастацкіх установах БССР за 1939 год павялічыўся на 559 чалавек.

З кожным днём расце палітычная актыўнасць членаў нашага саюза. Па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных зараз працуе 95 членаў саюза ў камісіях акруговых і ўчастковых, а таксама 176 агітатараў, якія праводзяць велізарную агітацыйна-масавую работу на выбарчых участках.

У новыя склады МК абраны лепшыя работнікі: народны артыст БССР Уладамірскі, заслужаныя артысты БССР Бірыла, Платонаў, Дзенісаў, Сяргейчык, акторы музкамедыі Астахаў, яўрэйскага тэатра—Моін, Дрэйзіна, у калгасных тэатрах—Кір'янаў, Карначык і іншыя.

Год таму назад ЦК ВКП(б) даў нашаму народу цудоўную кнігу «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», у стварэнні якой прымаў удзел мудры правадыр нашай партыі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

Совецкія акторы, як і ўсе працоўныя нашай краіны, з вялікай актыўнасцю ўзяліся за авалоданне марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Вялікую работу правялі па арганізацыі вывучэння гісторыі партыі мясцкомы Віцебскага тэатра, Філармоніі, Слуцкага тэатра, Віцебскага мастацкага вучылішча і інш.

У Філармоніі індывідуальна вывучаюць гісторыю партыі 26 чалавек. Мясцком у дапамогу вывучаючым правёў цікавую экскурсію ў дом першага з'езда РСДРП, арганізаваў лекцыі на тэмы 2 і 4 раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Віцебскі тэатр правёў тры тэарэтычныя канферэнцыі, на якіх выступалі з дакладамі народны артыст БССР Ільінскі, актор Вялікі і тав. Егудкін. Сістэматычна і глыбока вывучаюць гісторыю партыі акторы Дзяржаўнага опернага тэатра заслуж. артысты Дзенісаў, Балэцін, тав. Фрыдмо і інш.

Мясцком Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра арганізаваў лекцыі па класічных работах Леніна «Что такое «друзья народа» и как они воюют против социал-демократов?», «Что делать?», «Шаг вперед, два шага назад». Праведзены дзве тэарэтычныя канферэнцыі. Аднак, зараз мясцком тэатра і партыйныя арганізацыі не прадаўжаюць гэтай важнейшай справы. Амаль нічога не зроблена ў гэтым напрамку мясцкомам опернага тэатра і Заслаўскага калгасна-соўгаснага тэатра.

Не ўзначаліў вывучэння гісторыі партыі і сам Беларускі рэспубліканскі камітэт, які абмежаваўся адной толькі лекцыяй.

Вельмі мала праводзіў саюз культмасавых мерапрыемстваў. За 1938—39 год былі арганізаваны толькі тры лекцыі. Мала займаўся саюз такім важнейшым пытаннем, як ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці. У адным толькі оперным тэатры налічваецца 80 чалавек малапісьменных і непісьменных.

Наша краіна рыхтуецца да вялікага свята — выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Працаўнікі мастацтва Совецкай Беларусі і новаабраны Рэспубліканскі камітэт саюза сустрэнуць гэту гістарычную дату новым уздымам творчай, палітмасавай і прафсаюзнай работы.

В. СТЭЛЬМАХ.

Дзённік канферэнцыі

19—21 лістапада адбылася II рэспубліканская канферэнцыя саюза працаўнікоў мастацтва. 75 прадстаўнікоў калектываў работнікаў мастацтваў БССР сабраліся, каб падагуліць на канферэнцыі вынікі работы за двухгадовы перыяд. Справаздачны даклад аб рабоце Беларускага рэспубліканскага камітэта работнікаў мастацтва зрабіў старшыня камітэта тав. Зібцкер. Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Засл. арт. БССР Бірыла адзначыў тую велізарную работу, якую правялі тэатры па культурнаму абслугоўванню нашай слаўнай Чырвонай Арміі і насельніцтва вызваленай Заходняй Беларусі.

Адначасова тав. Бірыла паказвае на несур'ёзны падыход да фарміравання творчых брыгад, якія не заўсёды былі на належнай вышыні па свайму рэпертуару. Тав. Бірыла заклікае ўсіх працаўнікоў мастацтва да ўзмацнення падрыхтоўкі да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, [д]а разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва сярод работнікаў мастацтва.

Выступаючы ў спрэчках артыст тав. Кір'янаў (Заслаўскі соўгасна-калгасны тэатр) адзначыў, што рэспубліканскі камітэт не ўдзяляў увагі культурнаму росту калгасных тэатраў.

Беларускі камітэт саюза не ведае, што робіцца ў калгасных тэатрах, не ведае таго, што ў Полацкім калгасным тэатры доўгі час не было мастацкага кіраўніка і здольны малады мастацкі калектыў не мог расці, а Бабруйскі тэатр і цяпер не мае рэжысёра, яго часова замяняе актор тэатра Оўштэйн.

Акторка Яўрэйскага тэатра тав. Дрэйзіна ў сваім выступленні адзначае, што прафсаюзная арганізацыя не цікавілася творчым жыццём нашых тэатраў.

Дзіўна, кажа выступаючы ў спрэчках артыст музкамедыі тав. Астахаў, што такі вялікі атрад працаўнікоў мастацтва, як у БССР, не мае свайго клуба.

Тав. Герман расказаў дэлегатам канферэнцыі аб той вялікай рабоце, якую праводзяць нашы тэатры па культурнаму шэфству над Чырвонай Арміяй.

У канцы спрэчак выступіў начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Озірскі, які заклікаў працаўнікоў мастацтва БССР аказаць дапамогу акторам і мастакам Заходняй Беларусі, а таксама заклікаў актыўней працаваць па падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, якая з'яўляецца асноўным пытаннем далейшай работы працаўнікоў мастацтва БССР.

Літаратурны вечар у раненых байцоў

Мінскі Дом Чырвонай Арміі і руская секцыя ССПБ арганізавалі вялікі літаратурны вечар у Н-скім ваенным шпіталі. У клубе шпіталя сабраліся раненыя байцы, героі барацьбы за вызваленне працоўных Заходняй Беларусі ад ненавіснай шляхты.

Л. Шапіра перадаў раненым байцам прывітанне ад пісьменнікаў БССР і расказаў аб удзеле нашых пісьменнікаў у вызваленчай вайне, аб творах, якія яны пішуць па матэрыяле гістарычных вераснёўскіх падзей.

Аніва Левіна прачытала новыя вершы, прысвечаныя Заходняй Беларусі, К. Цітоў — цыкл абаронных вершаў на гэту-ж тэму, Л. Шапіра — апавяданне «Басок» (аб юным героі), Е. Садоўскі—апавяданне «Вечнік» (з сустрэч у Заходняй Беларусі).

Многія раненыя байцы абяцалі напісаць свае жывыя запіскі аб баях у Заходняй Беларусі.

Н.

ВЫДАТНЫ СПЕКТАКЛЬ

Балет „Салавей" у Тэатры оперы і балета БССР

Балет «Салавей» у Тэатры оперы і балета БССР — значная падзея ў жыцці беларускага мастацтва. Складаная задача стварэння першага беларускага балета выканана калектывам балета з гонарам. «Салавей» — балет яркі, прасякнуты сапраўдным драматызмам, лірычнасцю і народнасцю. Спектакль у радзе месц хвалюе гэтак-жа, як спектакль драматычнага тэатра.

Выдатны, поўны трапяткой юнацкай праменістасці вобраз Зоські ў выкананні засл. арт. БССР Нікалаевай — праўдзівы і жыццёвы. Балерына паказала, што ў балетным мастацтве побач з патрабаваннямі высокай тэхнікі неабходна шмат працаваць над стварэннем вобраза і ў гэтых адносінах яна дасягнула добрых рэзультатаў. У вобразе Зоські, у інтэрпрэтацыі Нікалаевай, няма і цені прыкрай саладжавасці, уласцівай трафарэтным балетным пейзанкам. А небяспека стаць на гэты шлях у рашэнні вобраза была вялікая.

У традыцыях класічнага балета мужчына заўсёды іграў толькі другарадную ролю. Гераіняй заўсёды была жанчына. У «Салаўі» героем з'яўляецца Сымон. Гэты смелы шаг і шаг зусім законны, але, на жаль, вобраз Сымона крыху слаба развіт у лібрэта.

Перад артыстам Дрэчыным стаяла цяжкая задача — стварэнне драматычнага характара сродкамі балета. Складанасць задачы ўзмацнялася няпоўнакаштоўнасцю лібрэтнага матэрыялу. Артыст Дрэчын знайшоў шмат яркіх свежых фарбаў, але вобраз у цэлым крыху няясны, а месцамі зніжаецца да фальшывасці. Выдатны танец гнева ў фінале другога акта лагічна не падрыхтаван развіццём дзеі, а таму неапраўданы. Танец перад панам і Вандай проста няўдалы. Сымон становіцца ўстановішча надзвычай недарэчнае.

Вельмі няясна абмалёван у балеце вобраз Ванды і яе адносіны да Сымона. Чаму Ванда аддае так шмат увагі Сымону? Калі ўрокам паслухмянасці, які дае Ванда Сымону, лібрэтыст і пастаноўшчык хацелі падкрэсліць толькі здзекі панны над хлопцам, дык чаму гэта робіцца падкрэслена адзін-на-адзін, не пры многіх сведках, ад чаго самалюб'е Сымона яшчэ больш было-б прыгнечана, а ўладалюбства Ванды атрымала-б большае задавальненне. Ва ўзаемаадносінах Ванды і Сымона намячаецца якаясьці няясная лінія, намёк на захапленне Ванды Сымонам. Лінія гэта як-быццам атрымлівае прадаўжэнне ў першай карціне трэцяга акта, калі Ванда разлучае Сымона з Зоськай і заручае яе з Макарам. Лінія гэта непатрэбна і яе трэба зняць. Балерына Васільева ў ролі Ванды яшчэ раз паказала бліскучае, мяжуючае з віртуознасцю тэхнічнае майстэрства. Побач з гэтым ёй удаецца стварыць вобраз халоднай, ганарлівай, капрызнай, патрабуючай усеагульнага пакланення і падпарадкавання панны.

Рэжысура спектакля не аднолькавая і ў гэтым адзін з слабых бакоў яе. У трактоўцы вобразаў, у вырашэнні сцэн не адчуваецца дастатковага творчага кантакта ў пастаноўшчыкаў — засл. арт. РСФСР ордэнаносца Ермалаева і засл. дзеяча маст. Лапухова. Другі акт па свайму рашэнню аказваецца чужым целам і ў развіцці дзеі і ў стылістычным рашэнні. Рэжысёр Лапухоў захапіўся эфектнасцю палацавых сцэн і недаравальна мала ўвагі звяртае на лінію Сымона і Зоські. Паводзіны Сымона ў другім акце прама дыскрэдытыруюць вобраз. Навошта, напрыклад, спатрэбілася пастаноўшчыку ўвэдзіць эфектны, але перашкаджаючы вобразу трук з люстрам, шмат раз выкарыстаны Лапуховым у ранейшых пастаноўках?

Выдатны па рэжысёрскаму раскрыццю першы і трэці акты. Пастаноўшчык засл. арт. рэсп. ордэнаносец Ермалаеў дасягнуў той сілы выразнасці, той яснасці, глыбіні ігры мыслі, якія ўласцівы сапраўднаму майстэрству. Гімнам любві прасякнута сцэна сустрэчы Зоські з Сымонам. Вельмі тонка адчуваюцца рэжысёрам фальклорныя танцы. Ён не механічна капіруе, а творча стварае. Добра пастаўлены масавыя танцы — лявоніха, юрачка, крыжачок, мяцеліца.

Творчасць пастаноўшчыкаў і артыстаў балета грунтавалася на поўнакаштоўным музычным матэрыяле. Музыка Крошнера— мелодычная, у ёй шмат сапраўднага драматызма, умельства творча апрацаваць народныя матывы. Відаць вялікая музычная культура кампазітара і велізарная яго праца.

Балет «Салавей» патрабуе яшчэ дапрацоўкі дэталей, але ў цэлым гэты балетны спектакль мае бясспрэчнае права быць паказаным на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

А. СЕГЕДЗІ.



НА ЗДЫМКУ: засл. арт. рэсп. А. В. НІКАЛАЕВА ў ролі Зоські, саліст балета С. ДРЭЧЫН у ролі Сымона, саліст балета БАБАНІН-ОРДЫНСКІ ў ролі Макара.

Фото І. Каплінскага.

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ

Адкрыццё карціннай галерэі ў Мінску з'яўляецца велізарнай падзеяй у жыцці нашага выяўленчага мастацтва.

Галерэя павінна адыграць вялікую ролю ў мастацкім жыцці і далейшым развіцці сацыялістычнага рэалізма ў выяўленчым мастацтве.

Экспазіцыйны матэрыял галерэі паступіў з фондаў Мінскага, Віцебскага, Магілёўскага і Гомельскага гістарычных музеяў, Ленінградскага рускага музея, Трэцьякоўскай галерэі, Музея выяўленчых мастацтваў імя Пушкіна, а таксама ад паасобных мастакоў і прыватных асоб.

Карцінная галерэя мае ў сваіх фондах звыш 1200 твораў жывапісу, графікі, скульптуры і фарфару.

У 15 экспазіцыйных залах размешчана звыш 400 экспанатаў, якія ілюстроўваюць развіццё выяўленчага мастацтва ад XVIII стагоддзя да нашых дзён.

XVIII стагоддзе, калі рэалізм уступіў у барацьбу з манерным ідэалізіраваннем людзей і падзей, прадстаўлена па жывапісу работамі: Антропава — мужчынскі партрэт, Рокатава—партрэт Загражскай і інш.; па скульптуры: Шубіна — бюст Румянцава, Растрэлі — «Бітва пры Гангуце» і інш.; па графіцы: Зубава, Чэмесава, Сокалава, Ухтомскага і інш.

Мастацтва першай паловы XIX стагоддзя развівалася ў двух напрамках: класіцызма і рамантызма. Экспазіцыя гэтага перыяда прадстаўлена па жывапісу работамі: Сокалава П. — «Сялянін на кані», Чэрнецова — «Егіпет», Брулова — партрэт, Флавіцкага — «Мучанікі», Заранка — жаночы партрэт і інш. У скульптуры гэтага перыяда віднейшым прадстаўніком класіцызма з'яўляецца Ф. Талстой, у галерэі выстаўлены яго барэльефы на тэму вайны 1812—1814 гг. Па графіцы выстаўлены работы Орлоўскага, Галакціёнава і інш.

Другая палова XIX стагоддзя ў экспазіцыі прадстаўлена работамі Айвазоўскага —«Зіма», «Парус у моры» і інш., Ярашэнка — «Мёртвае мора», «Стары у саламяным капялюшы» і інш., Шышкіна— «Лес», Васільева Ф. — пейзаж, Прянішнікава — «Падмаскоўная вёска», Крамскога — партрэт Антакольскага, партрэт невядомага і інш., Рэпіна — «У марах», партрэт Левіцкага і інш., Саўрасава — пейзаж са снапамі і інш., Левітана — «Лясны эцюд», «Дарога», Серова — партрэт Ушаковай, партрэт невядомай і інш. У скульптуры прадстаўлены бюст работы Антакольскага, як аднаго з піянераў рэалізма ў скульптуры; у графіцы — работы Уткіна, Іордана, Шышкіна і інш.

З совецкіх майстроў жывапісу прадстаўлены: Іогансон — «Пераход праз Сіваш», Багарэзскі — «Вечар у Тарусе», Котаў — «Гранаты», Ражскі — партрэт маладога чалавека; Радзімавы І. і П. — «Прамова Леніна на IV кангрэсе Комінтэрна» (фрагмент 1938 г.) і рад іншых, па графіцы: Чарушын, Круглікаў, Сокалаў, Ілья Рудакоў і інш.

Шырока прадстаўлена ў галерэі і творчасць беларускіх мастакоў. Выстаўлены работы беларускіх мастакоў старшага пакалення: Ю. Пэна. — «Майстар гадзіннікаў», «Вуліца ў Віцебску», Альперовіча —аўтапартрэт, пейзаж; Кругера — партрэт дзяўчыны і аўтапартрэт; Волкава В. В. — партрэты дачок, «Абмен вопытам», «Жаночая галоўка»; Гедда — «Калгасны статак»; з малодшага пакалення прадстаўлены Зайцаў—«Апошні бой Чапаева» (эскіз), «Пахмурны дзень» і інш.; Пашкевіч — «Партрэт мастачкі», «Параненыя таварыш» і інш.; Манасзон — «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск» і інш.; Дакальская — «Свіслач», Шаўчэнка — «Плыты ў затоне», мастак Заходняй Беларусі Цукерман — «Парыж», «Монмартр» і інш.

Апрача работ рускіх і беларускіх мастакоў, прадстаўлен жывапіс заходняга мастацтва: італьянскай, французскай, фламандскай і галандскай школ XVII—XVIII —XIX стагоддзяў.

У сучасны момант рыхтуецца да друку кароткі каталаг. Праведзена поўная рэстаўрацыя ўсіх экспаніруемых твораў работнікамі рэстаўрацыйнага аддзела Трэцьякоўскай галерэі. З 1 снежня гэтага года ў галерэі пачнецца цыкл лекцый па гісторыі мастацтва XVIII—XIX стагоддзя і совецкага мастацтва.

Н. МІХАЛАП.



МОТА ДЗЕХЦЯР

Памёр Мота Дзехцяр. Памёр наш дарагі таварыш, адзін з таленавіцейшых маладых празаікаў. Мы больш ніколі не пачуем непаўторнага, гучаўшага здаровым голасу Дзехцяра, голасу сапраўднага совецкага пісьменніка. Мы больш не пабачым яго, — тэмпераментнага, жыццерадаснага таварыша, які ўносіў у нашу літаратуру так многа непадробнай юнацкай свежасці, яркасці, красачнасці.

Толькі некалькі дзён таму назад мы атрымалі новую кнігу Дзехцяра «На нашай зямлі» Зараз пасланая па пошце аўтару, яна не знойдзе Дзехцяра ў жывых. Цяжка і балюча чытаць гэту кнігу, якая пачынаецца такой фразай: «Памёр малады цымбаліст Аніска...» Але-ж зусім нядаўна Дзехцяр чытаў нам гэта апавяданне пра цымбаліста Аніску, спыніўшага сваю песню на самай чыстай і высокай ноце. І ўжо сёння лёс героя нейкім дзіўным непрадбачаным чынам зрабіўся лёсам самога Дзехцяра.

Зусім нядаўна Дзехцяр чытаў нам свае апавяданні аб здаровых маладых будаўніках, аб сваёй радзіме, аб простых і сумленных людзях. Ён сам быў — косць ад косці, плоць ад плоці — сынам новай совецкай рэчаіснасці, яе натхнёным песняром.

І вось кароценькі ліст ад яго прыяцеля-чырвонаармейца прынёс сумную вестку аб смерці Дзехцяра. Не хочацца верыць, што мы больш не пабачым нашага Дзехцяра.

Мота Дзехцяр памёр. Мы вечна будзем памятаць нашага дарагога сябра.

Мы ніколі не забудзем цябе, дарагі таварыш, ніколі!

Вечная памяць табе!

Янка Купала, Якуб Колас, М. Лынькоў, З. Бядуля, З. Аксельрод, П. Броўка, Р. Брохес, Г. Бярозкін, Э. Агняцвет, П. Глебка, Р. Баумволь, А. Астрэйка, І. Гурскі, В. Вольскі, М. Грубіян, Г. Камянецкі, М. Клімковіч, З. Каган, С. Каган, А. Кучар, Л. Кацовіч, А. Куляшоў, В. Кандраценя, Р. Мурашка, М. Лійшыц, Х. Мальцінскі, Я. Маўр, М. Модэль, А. Платнер, М. Паслядовіч, Л. Талалай, З. Целесін, У. Фіннель, І. Сярэбраны, П. Панчанка, К. Чорны, М. Ільінскі, Р. Рэйз'н, Г. Рэлес, І. Разнік, Г. Шведзік, Хв. Шынклер, А. Якімовіч, А. Стаховіч, М. Целеш.

Памяці друга

Памёр малады таленавіты празаік М. Дзехцяр, памёр у росквіце сваіх сіл, у росквіце сваёй творчасці. Кожнае новае апавяданне Дзехцяра з'яўлялася радаснай падзеяй нашай літаратуры. Мы страцілі добрага пісьменніка і шчырага таварыша.

Над свежай магілай памёршага сябра схіляем мы нашы галовы.

Іцік ФЕФЕР, Г. ОРЛЯНД, Файвл СІТО, А. ГАНТАР.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці таленавітага яўрэйскага пісьменніка,

МОТЫ ДЗЕХЦЯРА

і выказвае свае спачуванне сям'і памёршага.

Праўленне ССПБ.

Пра „дзецтва" і выдавецтва

Зусім выпадкова давялося нам убачыць карэктурныя адбіткі кнігі, якая неўзабаве, як кажуць, «убачыць свет» у выданні Белдзяржвыдавецтва.

Тытульны ліст кнігі (яна ўяўляе сабой у мастацкай форме пераказаную біяграфію вядомага пісьменніка XIX ст.) адразу прыцягнуў нашу ўвагу сваёй поўнай арыгінальнасцю: у падзагалоўку на ім было напісана: «Дзецтва і юнацтва». Ужо тытульным лістом аўтар і выдавецтва інтрыгуюць чытача, паведамляючы яму зусім новыя факты з біяграфіі пісьменніка: яшчэ ў самую зялёную пару свайго жыцця — на зары юнацтва — паспеў гэты пісьменнік пабыць дзецкім пры нейкім княжаскім двары. Што і казаць, спрыт надзвычайны!

Уражаныя гэтым сенсацыйным паведамленнем, мы пачалі ўважліва гартаць карэктуру. Нас цікавіла, між іншым: як будзе паказана існаванне ў XIX стагоддзі інстытута дзецтва, уласцівага эпосе, што папярэднічала часу, які даследваў аўтар, стагоддзяў на 4—5?

Вельмі хутка нам прышлося расчаравацца: выявілася, што аўтар зусім не збіраўся ашаломліваць чытача якімі-небудзь сенсацыямі, — ён скромна, сур'ёзна і з поўным веданнем матэрыялу пісаў аб той пары жыцця пісьменніка, якая па-беларуску называецца: «дзяцінства» або «маленства».

Уся арыгінальнасць, нададзеная тытульнаму лісту, з'яўлялася заслугай і новым дасягненнем выдавецтва ў асобе яго паважаных стыльрэдактараў і проста рэдактараў. Якімі арыгінальнымі стылёвымі і моўнымі адкрыццямі парадуюць яны чытача ў згаданай кнізе — дапытвацца нам было няёмка: кніга яшчэ не «ўбачыла свету», чытаць-жа і абмяркоўваць карэктурныя адбіткі — справа далікатная, не кожнаму даступная.

Але цікавасць, выклікаваная выпадковым азнаямленнем з адбіткамі будучай кнігі, прызнаёмся шчыра, дужа непакоіла нас і мы вымушаны былі накіраваць яе на больш шырока вядомы аб'ект, даступны ўсеагульнаму азнаямленню. Тут якраз мы ўбачылі ў кніжным магазіне апошнюю навінку: «Апавяданні» І. С. Тургенева.

Мы разгарнулі кнігу. Пагледзелі на тытульны ліст. І... знаёмае ўжо адчуванне, што называецца, пранізала нас. «Пераклад з рускага» — прачыталі мы. Ах, гэта тытульны ліст! Якіх-небудзь тры-чатыры радкі друкарскага набору, а глядзі-ж, якое шырокае поле дзейнасці для дапытлівых ініцыятыўных розумаў.

Дапраўды: ну, чым здзіўляе чытача, звыклая, граматычна-вытрыманая фраза «пераклад з рускай мовы»? Бадай, нічым. Звычайны, так сказаць, трафарэт. І вось знаходзіцца таленавіты чалавек з арыгінальным мышленнем, які смела абнаўляе, асвяжае фразу, прымушае чытача адразу спыніць на ёй увагу.

Але-ж то—тытульны ліст! Усяго якіх тры-чатыры радкі. Ды такія, што цалкам ва ўладзе выдавецтва... Зусім іншае — аўтарскі тэкст. Што можна, напрыклад, зрабіць з Тургеневым? Тургенеў — папулярны і любімы народам пісьменнік, тэксты яго — агульнавядомыя, да іх нічога не дадасі, ды і не адбярэш нічога. Адным словам — класік, фігура, якая не паддаецца апрацоўцы.

Можна зразумець і дараваць нашу, удвая падагрэтую тытульным лістом, цікавасць: як справіліся стыльрэдактары і проста рэдактары з Тургеневым?

Мы купілі кнігу. Мы прачыталі яе. І гэта не было марным «пераводам» часу. Мы канчаткова пераканаліся ў надзвычайных здольнасцях і невычарпальных магчымасцях слаўнага выдавецкага апарата: ён перамог Тургенева, ён здольны зламіць супраціўленне самага непадатнага, самага класічнага матэрыяла! Мы былі ўзрушаны. Мы ўжо бачылі тыя вышыні, на якія можа ўзвесці ўсю сусветную літаратуру наша выдавецтва, апіраючыся на свой выпрабаваны апарат. Мы — жахнуліся...

Сапраўды. Вазьміце ягдташ. Звычайны паляўнічы ягдташ, у якім носяць забітую дзічыну. Або пляшку з якой змораны паляўнічы прагане смагу. Невялікія, прымітыўныя, можна сказаць, рэчы. Кожны паляўнічы носіць іх пры сабе. Так думаў і Тургенеў. І як ён памыляўся! Які недальнабачны быў гэты выдатны класік і страсны паляўнічы... Мы пераканаліся ў гэтым, пазнаёміўшыся з вынаходкай слаўных работнікаў нашага выдавецтва: яны знайшлі новае прыстасаванне гэтым рэчам. На стар. 45, 46 безапеляцыйна сцвярджаецца, што ягдташ і пляшку можна зусім свабодна **апранаць**. Вы разумееце, якая гэта палёгка для паляўнічага?! Не трэба табе ні дажджавіка, ні, скажам, ботаў — апрані на сябе ягдташ і пляшку і — будзь здароў, палюй на славу! Лёгка і зручна.

Гэта — не гаворачы ўжо пра абнаўленне аўтарскага тэкста, пра наданне яму новага гучання. Над гэтым выдавецтва папрацавала найбольш старанна. Вось Тургенеў гаворыць: «приживалки **отчаянно** замахали руками на Степана». Звычайнай устурбаванасці, усхваляванасці выдавецтва надае новыя нюансы: «прыжывалкі... **гарэзна** замахалі рукамі» (стар. 80). І адразу выявілася новая рыса ў характары бабулек-прыжывалак, якой не заўважыў наіўны Тургенеў.

Гэтак-жа вынаходліва і ўдала інтэрпрэтыруецца тэкст класіка і ў іншых месцах. Калі, напрыклад, русалка («Бежын луг») гаворыць Гаўрылу: «жил-бы со мной ни **веселии** до конца дней», дык выдавецтва разгортвае гэты сказ, даводзіць думку аўтара да лагічнага канца (стар. 17) і ператварае «веселие» у «свадьбу» **(вяселле)**. Гэтак-жа смела «разорённого» чалавека яно робіць «зруйнаваным», а «угрюмого» — «змрочным» (стар. 36). Вядомы тургенеўскі Бірук, паводле інтэрпрэтацыі выдавецтва, у адным месцы (стар. 32) «спыніўся і **абярнуўся**». І хоць абярнуўся — павадзіўся ён, але спакойна гутарыў далей са сваім субяседнікам. Тургенеў, відавочна, не прадбачыў гэтай здатнасці Бірука, калі прымушаў яго толькі павярнуцца, паглядзець назад, азірнуцца. Наўна, не зусім тонка ведаў Тургенеў свайго персанажа і тады, калі пісаў пра хлопчыка, што гуляе на беразе ракі. У апошнім, з ласкі ДВБ, варыянце гэты хлопчык ужо **«граў на беражку»** (стар. 25). Не паказан толькі інструмент, на якім граў хлопчык, як, нажаль, не пазван ён і ў другім выпадку, калі «зноў хлынулі **граючыя** праменні» (стар. 7). Гэта ўжо — прыкры недагляд выдавецкага тлумача класічных тэкстаў... Аднак, мы ўсё-ж уяўляем узрушаючы малюнак, калі праменні граюць, скажам, на **арфе** альбо лютні!

Ах, Іван Сяргеевіч... Да чаго абмежаваным было поле вашых назіранняў, які невысокі палёт фантазіі. Возьмем прыроду, — натуру. Вас лічаць майстрам пейзажа — **сакаўнога, шматкалярована**. Вы апісваеце, напрыклад, ліпеньскі вечар, заканчваючы цудоўны малюнак такім сказам: «на всём лежит отпечаток **какой-то трогательной кротости**». А пагледзіце, як гучыць гэта месца ў варыянце ДВБ (стар. 8): «адбітак нейкай **чулай рахманасці**». Як не адчулі вы ласкавага дотыку рахманага вечара і цёплай слязы яго на сваёй рудэ?.. Праўда, тут мы можам вам яшчэ дараваць: было цемнавата, вы не заўважылі рахманасці і чуласці вечара. Але як не маглі вы адчуць і зразумець паводзін звычайнага дажджу, калі пісалі, што ён **«перестал»**. Пагледзіце (стар. 33 і 36) у варыянт ДВБ: «дождж(ык) **спыніўся**». Разумееце? Спыніўся, стаў і стаіць — ані з месца. Хіба гэта не маляўніча? Або: **«сталае** надвор'е» (стар. 8), **«невытлумачальная** цішыня» (стар. 41). Якая вычарпальная канкрэтнасць! У адным месцы вы пішаце: «верст десять пробирались вы по **проселочным** дорогам — вот, наконец, большая». Значна выйграе гэты сказ у разглядаемым намі варыянце: «вёрст дзесяць прабіраліся вы па **вясковых дарогах** — вось, нарэшце, вялікая» (стар. 42). Уяўлеце вы сабе вёску з дарогамі на дзесяць вёрст, апрача вялікай?!

Зноў-жа, канцоўкі вашых твораў. Усім вядома іх яснасць, празрыстасць. Яны гучаць, як апошні хвалюючы акорд. Аднак, згадзіцеся, вы не вычарпалі ўсіх магчымасцей. І тут вам на дапамогу прыходзяць клапатлівыя майстры мастацкага слова з выдавецтва. Вы пішаце ў «Муму»: «такова **ходит молва** о богатырской силе немого». Куды выразней гучыць гэта ў новым варыянце: «такія **ходзяць гутаркі** пра незвычайную сілу нямога». Або ў творы «Лес і стэп» вы пішаце: «Прощайте, читатель; желаю вам **постоянного благополучия**». Куды больш чула, зычліва і прыязна гучыць выдавецкае: «жадаю вам **сталага дабрабыту**».

***

На гэтым, бадай, можна было-б скончыць агляд новых дасягненняў нашага выдавецтва ў галіне пашырэння мастацкага слова. Але мы ніяк не можам абмінуць адной надзвычай выдатнай акалічнасці ў гэтай звышкарыснай дзейнасці выдавецтва: яно не засакрэчвае сваёй крапатлівай працы, яно не хавае ад нас сваёй навуковай лабараторыі, гасціна паказваючы свае, так сказаць, «даследчыя дзялянкі». З той-жа кнігі Тургенева мы даведваемся, што:

1) Выдавецкія майстры мастацкага слова яшчэ канчаткова не ўстанавілі, як пісаць: «аўраг» ці «роў» або «яр», «высца» ці «вэстраў», «лоўкі» ці «спрытны», «пані» ці «барыня». Знайшлі мы і «дзяцінства», — відаць «дзецтва» яшчэ не перамагло!

2) Канчаткова не высветлена, якога роду слова «сабака» — мужчынскага ці жаночага.

3) Не аддадзена перавага якой-небудзь літары для агульнага кораня слова, а таму ўсюды пішацца «бліскануда», але «водблеск».

4) Застаецца таксама дыскусійным пытанне аб паланізмах. Таму замест слоў «іменна», «лакей», «кабінет», «нястачы», пішацца: «менавіта», «лёкай», «габінет», «нэндза».

5) У галіне гістарычных навук выдавецкія майстры таксама маюць свае арыгінальныя погляды, а таму ў рэдакцыйнай зносцы на стар. 72, яны сцвярджаюць, што Мінін і Пажарскі выступалі супроць сялянскай рэвалюцыі і змаганне іх з палякамі, якія занялі Маскву, было бадай ці не школьнай справай.

Не будзем, чытач, займацца падлікам выдаткаў на «пераклад» часу і паперы шаноўнымі майстрамі мастацкага слова... Зробім толькі адно: карыстаючыся слаўнай і далікатнай мовай майстроў, пажадаем ім «сталага дабрабыту!».

Д. ОСІПАЎ.

ХРОНІКА

„ЦУДОЎНАЯ ДУДКА" на рускай мове

П'еса В. Вольскага «Цудоўная дудка» перакладзена на рускую мову вядомым дзіцячым драматургам Александрай Бруштэйн. «Цудоўная дудка» прынята да пастаноўкі Цэнтральным тэатрам юнага гледача ў Маскве. Над пастаноўкай працуе рэжысёр А. Н. Бендэрскі. Музыку да п'есы піша кампазітар І. Коўнер.

Яўрэйскія пісьменнікі Украіны ў Мінску

Днямі ў Мінск прыехала група яўрэйскіх пісьменнікаў Украіны ў складзе паэта-ордэнаносца І. Фефера, празаіка Г. Орлянда і маладых пісьменнікаў Ф. Сіто і А. Гантара.

Сустрэча пісьменнікаў Заходняй Беларусі з студэнтамі

15-га лістапада адбылася сустрэча пісьменнікаў Заходняй Беларусі з студэнтамі і выкладчыкамі Мінскага педагагічнага інстытута. Вечар прайшоў у атмасферы выключнай цеплыні.

Невялікі даклад аб творчасці нашых гасцей зрабіў тав. Кучар. Паэты Максім Танк, Ф. Пестрак, М. Машара, Ніна Тарас, Б. Гелер, Ан. Іверс і Л. Моргентой чыталі свае творы.

У вечары прымалі ўдзел таксама паэты Совецкай Беларусі — т.т. Якуб Колас, А. Куляшоў, П. Панчанка, М. Грубіян, Э. Агняцвет і С. Каган.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394 Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Р—2049.